Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛІСТАПАДА 2007 г. ПЯТНІЦА

№ 223 (26088)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага: «прамыя лініі»!

ЗДАРОЎЕ ЖАНЧЫНЫ — ЗДАРОЎЕ НАЦЫІ

На любыя вашы пытанні, паважаныя жанчыны, адкажуць унікальныя мужчыны, аўтары ўсіх сучасных падручнікаў па акушэрству і гінекалогіі для будучых беларускіх спецыялістаў (студэнтаў і навучэнцаў) у агучанай галіне дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук **Віталь Іванавіч ДУДА** і дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук **Уладзімір Іванавіч ДУДА**.

«Прамая лінія» адбудзецца **СЁННЯ, 23 лістапада, з 15.00 да 17.00** па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

КАЛІ ЗАХВАРЭЛА ДЗІЦЯ

Разам з асенне-зімовым часам прыйшоў і набор сезонных захворванняў: грып, ВРЗ, іншыя рэспіраторныя інфекцыі. Найбольш схільнымі да іх з'яўляюцца дзеці. Якія небяспечныя сімптомы павінны насцярожыць бацькоў? Як дапамагчы малым падчас хваробы? Ці варта рабіць ім прышчэпкі супраць грыпу? Якія ўскладненні можа прынесці звычайная прастуда? А таксама ўвогуле ад якіх інфекцыйных хвароб і як трэба засцерагаць сваіх дзяцей? На гэтыя і іншыя пытанні нашым чытачам падчас «прамой лініі» адкажа загадчык кафедры дзіцячых інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, дацэнт, галоўны пазаштатны дзіцячы інфекцыяніст рэспублікі **Іна Генадзьеўна ГЕРМАНЕНКА.**

«Прамая лінія» адбудзецца **30 лістапада, у пятніцу, з 12.00 да 13.30** па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

У Беларусі маладым і шматдзетным сем'ям будзе аказана дапамога ў выплаце няльготных крэдытаў на жыллё

Маладым і шматдзетным сем'ям пры нараджэнні або наяўнасці непаўнагадовых дзяцей будзе прадастаўляцца фінансавая падтрымка дзяржавы ў пагашэнні запазычанасці па няльготных крэдытах, выдадзеных банкамі на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў. Адпаведны ўказ № 585 Прэзідэнт Беларусі падпісаў 22 лістапада.

Дакумент выдадзены ў мэтах выканання падпраграмы «Сацыяльная абарона сям'і і дзяцей» прэзідэнцкай праграмы «Дзеці Беларусі» на 2006—2010 гады.

Так, у выпадку нараджэння першага дзіцяці або пры наяўнасці аднаго непаўнагадовага дзіцяці маладым сем'ям аказваецца дапамога ў памеры 20 бюджэтаў пражыткавага мінімуму, пры нараджэнні другога дзіцяці або наяўнасці дваіх непаўнагадовых дзяцей — 40 бюджэтаў пражыткавага мінімуму. Шматдзетным сем'ям пры наяўнасці траіх непаўнагадовых дзяцей або ў выпадку нараджэння трэцяга дзіцяці і наступных дзяцей фінансавая падтрымка складзе 50 бюджэтаў пражыткавага мінімуму.

Фінансавая падтрымка будзе прадастаўляцца па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Парадак яе аказання замацаваны ў адпаведным палажэнні да ўказа.

Правам на яе атрыманне карыстаюцца маладыя і шматдзетныя сем'і незалежна ад узроўню іх даходу, што стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў або стаялі на такім уліку на дату заключэння з банкам крэдытнага дагавора, якія не рэалізавалі свайго права на атрыманне льготных крэдытаў на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў прыняць меры па змяншэнню кошту адпачынку ў Беларусі

Прэзідэнт Беларусі даручыў прадоўжыць работу па змяншэнню кошту адпачынку, а таксама па паляпшэнню ўмоў для адпачынку і лячэння. Такую задачу Аляксандр Лукашэнка паставіў у час даклада старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Леаніда Козіка.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб сітуацыі ў прафсаюзным руху Беларусі. Прафсаюзныя камітэты прадпрыемстваў, арганізацый, установаў рэспублікі строга сочаць за захаваннем правоў членаў прафсаюзаў: за аховай працы, узроўнем арганізацыі вытворчасці, пытаннямі своечасовай выплаты заработнай платы, аздараўлення працоўных.

Закранаючы пытанне выканання ФПБ палажэнняў Дырэктывы № 3, Леанід Козік адзначыў, што Федэрацыя разгарнула масавую работу сярод насельніцтва па пытаннях эканоміі і беражлівасці: праводзіць спаборніцтвы за лепшыя паказчыкі па забеспячэнні эканоміі энергарэсурсаў, а таксама стымулюе прымяненне энергазберагальных тэхналогій.

Прэзідэнту даложана аб міжнароднай дзейнасці Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, у прыватнасці, аб нядаўніх сустрэчах Леаніда Козіка з замежнымі прафсаюзнымі лідарамі.

У час сустрэчы было падрабязна абмеркавана пытанне аздараўлення насельніцтва рэспублікі. Кіраўніку дзяржавы даложана аб выкананні яго даручэння, даднесенага ў мінулым годзе, па захаванню прафсаюзнай сістэмы аздараўлення і пашырэнню магчымасцяў адпачынку для ўсіх катэгорый грамадзян. У гэтым годзе 40 працэнтаў пуцёвак аздараўленчымі ўстановамі ФПБ было прададзена іншаземным грамадзянам. Каля 16 тыс. адпачываючых у прафсаюзных здраўніцах склалі расіяне, крыху больш як 10 тыс. — грамадзяне іншых дзяржаў: Літвы, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Ізраіля. У асобныя месяцы іншаземцамі было занята да 70 працэнтаў месцаў. Паводле слоў Леаніда Козіка, аздараўленчы адпачынак у Беларусі становіцца ўсё больш папулярным. Гэта звязана ў многім з якасцю медыцынскага абслугоўвання, а таксама яго адносна невысокім коштам.

У гэтым годзе ў аздараўленчых лагерах адпачылі больш як 440 тыс. дзяцей. ФПБ на дзіцячы адпачынак затраціла Br1,9 млрд. Усе жадаючыя мелі магчымасць накіраваць дзіця ў загарадны або школьны аздараўленчы лагер. Аднак, паводле слоў Леаніда Козіка, некаторыя пастановы ўрада перашкаджаюць захаванню сістэмы дзіцячага аздараўлення. У прыватнасці, гэта датычыцца пытанняў работы дзіцячых устаноў у асенне-зімовы перыяд, а таксама пераходу іх з прыстасаваных памяшканняў у капітальныя будынкі. Старшыня ФПБ адзначыў, што такія магчымасці ў дзяржавы ёсць. Прэзідэнт даручыў падрабязна праінфармаваць яго аб сітуацыі.

Кіраўніку дзяржавы таксама даложана аб рэканструкцыі і рамонце спартыўных, санаторных, турысцкіх аб'ектаў ФПБ. Прэзідэнт адобрыў работу Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, а таксама ініцыятыву ФПБ аб аднаўленні аб'ектаў за кошт членскіх прафсаюзных узносаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ШОПІНГ — НЕАБХОДНАСЦЬ ЦІ ЗАДАВАЛЬНЕННЕ?

Ёсць нагода!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сёння — Сусветны дзень без пакупак, дэвіз якога: «Перад тым як нешта набыць, — падумай, ці сапраўды табе гэта патрэбна». Ён быў уведзены з мэтай змяніць псіхалогію спажывецкіх адносінаў зямлян да прыродных рэсурсаў. Упершыню яго святкавалі ў 1992 годзе ў ЗША, дзе сёння ўзровень спажывання ў 30 разоў вышэйшы, чым у Індыі. Аўтар самой ідэі правядзення Дня — рэкламіст Тэд Дэйв, які перакананы: «Рэклама падманвае, калі абяцае, што мы станем больш шчаслівымі, калі набудзем больш рэчаў. Яна выклікае пачуццё незадаволенасці і сквапнасць».

Мы пацікавіліся, а ЯК БЕЛАРУСЫ СТАВЯЦЦА ДА ШОПІНГУ? ЦІ РОБІЦЬ ПРАЦЭС НАБЫЦЦЯ ПАКУПАК ІХ БОЛЬШ ШЧАСЛІВЫМІ? ЦІ МОГУЦЬ ЯНЫ ПРАЖЫЦЬ АДЗІН ДЗЕНЬ УВОГУЛЕ БЕЗ ПАКУПАК?

Антаніна ПАЗДНЯКОВА, бухгалтар СТАА «Лібрэтык»:

— У мяне ўсё залежыць ад настрою, хоць па вялікім рахунку шопінг для мяне — гэта сапраўднае мучэнне. У адрозненне ад многіх жанчын я не люблю цэлы дзень гуляць па гандлёвых цэнтрах, выставах і буціках. Мяне хапае толькі на гадзіну, і хаджу я па магазінах не ад таго, што няма чаго рабіць, а з канкрэтнай мэтай: набыць джынсы, абутак і г.д. Безумоўна, калі я набываю нешта вельмі прыгожае, што мне пасуе, — настрой адразу ўзнімаецца. Мяне задавальняе вынік шопінгу, а не сам гэты працэс. А дзень без пакупак я магу пражыць лёгка: чым радзей я хаджу па магазінах, тым больш спакойна сябе адчуваю. Прадуктамі харчавання «затарваюся» раз у тыдзень.

Выканаўчы дырэктар Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад-2007» Іна Аксёнава:

— Шопінг робіць мяне больш шчаслівай, гэта сапраўды задавальненне. Я рэгулярна «выкройваю» на гэта час. Пражыць дзень без пакупак я магу, залежнасці ад шопінгу ў сябе не адчуваю. Самае важнае — знайсці тую рэч, якая сапраўды прынясе мне максімум задавальнення. Я магу патраціць на яе выпадкова, альбо шукаць некалькі месяцаў (скажам, на пошук нейкіх шыкоўных туфляў я гатова патраціць нават год, абы яны адпавядалі маім патрабаванням). Вельмі важныя суадносіны цаны і якасці, аднак калі рэч мне падабаецца, я гатова аддаць за яе і вельмі вялікую суму. Гэта датычыцца шыкоўнай бязліны, нейкіх жаночых аксесуараў, якія не з'яўляюцца прадметамі першай неабходнасці, аднак дапамагаюць мне адчуваць сябе жанчынай з іскрынкай. Калі ёсць вольны час, я з задавальненнем хаджу па магазінах, мяне гэта расслабляе.

Самыя хадавыя тавары прадаўцы выкладаюць на ўзроўні вачэй, танныя апускаюць на ніжнія паліцы, а больш дарагія — вышэй. І мне вельмі падабаецца выбіраць менавіта з апошняй групы. Там часта трапляюцца тавары незвычайныя, нязвыклыя. Пошук навінак, пашырэнне свайго спажывецкага кругагляду прыносіць мне вялікае задавальненне. Калі даводзіцца эканоміць, раблю гэта за кошт цыгарэт і алкаголю і ніколі — за кошт падарункаў сябрам і родным.

Леанід КАВАЛЁЎ, першы сакратар ЦК БРСМ:

— Для мяне шопінгу ў прынцыпе не існуе: па магазінах звычайна ходзіць жонка. Я магу літаральна на 15 хвілін выскачыць — набыць тое, што трэба, і зноў паглыбіцца ў справы. Хоць працэс набыцця пакупак прыносіць мне задавальненне. Асабліва калі даводзіцца выбіраць падарункі. Дзень без пакупак я магу пражыць лёгка. Што там дзень, я і два месяцы магу без гэтага пражыць.

Святлана СУХАРКА, журналіст Беларускага радыё:

— Шопінг здольны ўзняць настрой, асабліва калі гаворка ідзе пра нейкую рэч, аб якой ты доўга марыш, ці не рашаешся набыць з-за высокай цаны. Калі ў мяне сапсаваны настрой, я абавязкова раблю пакупкі. Магу набыць нават нязначную рэч, хай сабе і драбязу, абы зняць стрэс. Як і ўсе жанчыны, я гатова рабіць пакупкі кожны дзень. Для мяне шопінг — гэта абавязковая штотыднёвая працэдура. Дзень без пакупак я пражыць не магу — як жа пазбавіць сябе такога прыемнага працэсу? Нават калі ў кашальку ліміт грошай, я куплю хоць дробязь.

Аляксандр ЛУКАВЫ, дырэктар рэстарана «Залаты век»:

— Асабіста мяне шопінг вельмі раздражняе, не атрымліваю я ад яго ніякага задавальнення. Займаюся гэтым толькі па неабходнасці, а ўвогуле лічу дарэмным марнаваннем часу. У мяне зараз рамонт у кватэры, даводзіцца набываць розныя будматэрыялы, гэта мяне, скажу шчыра, прыгнятае. Выключэнне складае выбар падарункаў для родных — прыемна іх парадаваць. Дзень без пакупак пражыву лёгка.

Васіль ХРОЛ, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь:

— Часу на шопінг я выдзяляю няшмат, раблю гэта двойчы ў месяц (пакет малака і бохан хлеба шопінгам не назавеш). Тым не менш шопінг для мяне — гэта спосаб атрымаць станоўчыя эмоцыі. Асабліва ў дзень выдачы зарплаты. Мне вельмі прыемна рабіць падарункі сваім родным і ў гэты дзень я абавязкова набываю нешта для дачкі і кветкі для жонкі. Ад усведамлення, што я трачу грошы на сваю сям'ю, у мяне павышаецца настрой і жыццёвы тонус. Увогуле, без пакупак я жыву 28 дзён у месяц.

Запісала Інга МІНДАЛЁВА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

НА ВЫХАДНЫЯ ПАЦЯПЛЕЕ ДА ПЛЮС 8

Напрыканцы тыдня да нас завітаюць цёплыя паветраныя масы з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

Таму ўжо ў суботу — нядзелю на большай частцы тэрыторыі Беларусі пройдуць адносна цёплыя дажджы. Месцамі ў гэтыя дні раніцай і ўначы будзе туман і галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак ад 0 да плюс 6 градусаў, а ўдзень у Гомельскай вобласці — да 8 градусаў цяпла.

Яшчэ ў панядзелак будзе цёпла і дажджліва, а вось 27 лістапада пачнецца паніжэнне тэмпературы і ападкі будуць ужо ў выглядзе мокрага снегу. Тэмпература паветра на працягу сутак ад 3 марозу да 3 цяпла. Асобна сіноптыкі папярэджваюць, што ў аўторак па паўднёвым усходзе краіны ападкі месцамі вельмі моцныя, што можа выклікаць істотнае наліпанне мокрага снегу. У сераду ападкі спыняцца, але стане яшчэ халадней. Тэмпература паветра ўначы — 1—7 градусаў марозу, пры праясненнях да мінус 11—13 градусаў, удзень мінус 4—плюс 1 градус.

Сяргей КУРКАЧ.

ПАВЫШАНЫ ЦЭНЫ НА МЯСА І МАЛАКО

Рознічныя цэны на малочныя прадукты паніжанай тлустасці (малако і кефір тлустасцю да 1,5 працэнта ўключна, смятану тлустасцю да 15 працэнтаў уключна, тварог тлустасцю да 5 працэнтаў) павышаны да 6 працэнтаў, на малако, кефір, смятану і тварог больш высокай тлустасці — да 14,8 працэнта, на ялавічыну і свініну — да 8 працэнтаў. Такое рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Міністэрства эканомікі ад 20 лістапада 2007 года № 201 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у пастанову Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь ад 28 сакавіка 2007 г. № 56».

У аналагічных памерах прадугледжана павелічэнне і гранічных адпускных цэнаў. Паводле інфармацыі Мінэканомікі, дадзеная пастанова прынята ў сувязі з павелічэннем закупачных цэнаў на прадукцыю жывёлагадоўлі і ў мэтах кампенсацыі падаражання кошту асноўнай сыравіны, якая займае ў структуры сабекошту малочнай і мясной прадукцыі ў сярэднім больш за 70 працэнтаў, а таксама недапушчэння пагаршэння фінансавага становішча перапрацоўчых прадпрыемстваў. Каментуючы прынятыя меры, у міністэрстве адзначаюць, што яны накіраваныя на скарачэнне дадатковага разрыву ў цэнах на мяса-малочную прадукцыю ў Беларусі і Расіі, які ўзнік у апошні час. Акрамя таго, апошняе рашэнне, паводле меркавання спецыялістаў, дазволіць папярэдзіць некантралюемы яе вываз з тэрыторыі нашай рэспублікі. Між іншым, сярэднія закупачныя цэны ў РФ, як вынікае з даных Мінэканомікі, перавышаюць закупачныя цэны на малако, якія дзейнічаюць у нашай краіне, у 2 разы, на буйную рагатую жывёлу і свіней — у 1,3—1,7 раза. Рознічныя ж цэны на малочную прадукцыю раней у нашай краіне ў параўнанні з краінай-суседкай былі меншымі ў 1,5—2 разы, а ў асенні перыяд разрыў у цэнах павялічыўся яшчэ на 20—30 працэнтаў.

У міністэрстве таксама адзначаюць, што павелічэнне цэнаў увязана з прынятымі ўрадам з 1 лістапада папераджальнымі мерамі па ўзмацненні сацыяльнай абароны насельніцтва, якія прадугледжваюць павышэнне тарыфнай стаўкі першага разраду з 65 да 70 тысяч рублёў, а таксама павышэнне працоўных пенсій на 9,3 працэнта.

Ігар ГРЫШЫН.

ПРЫХАДЖАНЕ АТРЫМАЛІ... ФЛІКЕРЫ

Падчас мінулай Дэкады бяспекі дарожнага руху, што прайшла ў нашай краіне, на тэрыторыі Віцебскай вобласці не загінуў не адзін пешаход. Аб гэтым паведаміў «Звяздзе» начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама Леанід Фармагей.

Паводле яго слоў, цяпер у 80 працэнтах (а ў некаторых раёнах і больш) насельніцтва ёсць флікеры і г. д. У Сенненскім раёне вырабляюць рабочае адзенне з абавязковымі элементамі, што дазваляюць людзям быць бачнымі ў цёмны час сутак.

Сярод ноў-хаў у гэтым накірунку: раздача флікераў прыхаджанам храмаў. Дзякуючы супрацоўніцтву з Белдзяржстрахам і страхавой кампаніяй «Бі энд Бі Іншурэнс» , усяго людзям раздалі флікераў на агульную суму 8 млн. рублёў. Кіраўнік УУС шчырыя словы ўдзячнасці за актыўны ўдзел у правядзенні дэкады выказаў у адрас губернатара Віцебшчыны, рэктараў ВНУ, РУП «Белпошта», рэдакцыі нашай з вамі газеты «Звязда» і іншым.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПРАТАКОЛАМІ ПА КАНКУРЭНТАХ

Жыхар Гомеля вырашыў рукамі старшага інжынера гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях прыбраць са свайго шляху канкурэнтаў па бізнэсу.

Паводле звестак Генеральнай пракуратуры, камерсант перадаў выратавальніку 400 долараў. За гэтыя грошы старшы інжынер склаў на індывідуальных прадпрымальнікаў — канкурэнтаў хабарадаўцы — адміністрацыйныя пратаколы. Неўзабаве супрацоўнікі праваахоўных органаў вывелі на чыстую ваду нядобрасумленнага выратавальніка. Суд прыгаварыў старшага інжынера да 7 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287 17 41

БАЦЬКІ ЗА ПЕРАВОЗКУ ШКОЛЬНІКАЎ ПЛАЦІЦЬ НЕ БУДУЦЬ

З вёскі Нарку́ны Лідскага раёна ў «Звязду» звярнуліся бацькі вучняў суседняй Крупаўскай сярэдняй школы з пытаннем: ці будуць у хуткім часе школьнікі падвозіцца да навучальнай установы бясплатна?

— Усе мы ўважліва прачыталі ў вашай газеце Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян» ад 16 чэрвеня, у прыватнасці, яго артыкул 15, дзе гаворка ідзе пра льготы на праезд ад месца жыхарства да месца навучання школьнікам, — гаварылі заяўнікі. — Цяпер дзеці ездзяць на маршрутцы «Ліда—Радунь» з вёскі ў школу бясплатна, але праязныя дакументы ў іх выпісаны толькі да 15 снежня. З наступнага пасля гэтай даты дня ў сілу ўступае новы Закон. Што будзе далей? Як мы зразумелі, бясплатны праезд для нашых дзяцей павінен захавацца, аднак, паводле слоў дырэктара школы, з 16 снежня бацькі павінны будуць цалкам аплачваць праезд школьнікаў. У райвыканкамах нашым прадстаўнікам агучылі іншую версію: трэба будзе плаціць толькі 50 працэнтаў. Чаму ці каму верыць? З нашай вёскі ў школу штодня ездзіць за 5 кіламетраў 25 дзяцей усіх узростаў. Кошт праезду ў адзін бок складае 500 рублёў, выходзіць, у дзень на білеты для аднаго дзіцяці трэба будзе рыхтаваць тысячу рублёў?

Як патлумачылі нам ва ўпраўленні адукацыі Лідскага райвыканкама, літаральна напярэдадні нашага звароту адбыўся абласны семінар з удзелам прадстаўнікоў упраўленняў адукацыі, дзе разглядалася і пытанне дастаўкі вучняў у школы. «Гэта функцыя ў сельскай мясцовасці — прамы абавязак мясцовых органаў улады, таму можаце заспакоіць бацькоў: школьнікаў па-ранейшаму будуць падвозіць, прычым бясплатна для іх бацькоў. Так, білеты выпісаны да 15 снежня, бо з 16-га новы Закон уступае ў сілу. Але да гэтага часу адпаведныя меры будуць прынятыя. Выдаткі аўтапаркам па перавозцы школьнікаў будуць кампенсаваны за кошт мясцовага бюджэту, але гэтыя нюансы, якія зараз знаходзяцца ў стадыі вырашэння, бацькоў і іх дзяцей напрамую не датычаць».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Еўра-2008

ЧАС ЭКСПЕРЫМЕНТАЎ СКОНЧЫЎСЯ. ЦЯПЕР — ТОЛЬКІ ПЕРАМОГІ!

Неспрыяльнае, на гэты раз туманнае, надвор'е ў чарговы раз імкнулася сапсаваць свята вялікага футбола ў беларускай сталіцы. Тым не менш, перамогай 2:1 у матчы Беларусь—Галандыя завяршыўся няпросты шлях нашай нацыянальнай зборнай у кваліфікацыйным раўндзе чэмпіянату Еўропы.

Перамога ў гульні прынесла чацвёртае месца ў групе, якое зусім нядаўна, у часы экстрэмальнага эксперыментатарства Бернда Штанге лічылася недасягальнай раскошай, а на пачатку адборачнага цыкла на чале яшчэ з Юрыем Пунтусам абазначала правал. Хоць зараз, пасля нядаўніх узлётаў і падзенняў, дакладней трагікамічнага пройгрышу Люксембургу і феерычных перамог над Албаніяй і Галандыяй, чацвёртае месца здаецца аб'ектыўным для такой рознай і непрадказальнай беларускай зборнай.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дамашнюю перамогу над камандай Марка ван Бастэна, ад якой у рэйтынгу нас аддзяляе глыбокая бездань у восемдзесят з лішнім пазіцый, можна тлумачыць і адсутнасцю матывацыі саперніка па прычыне датэрміновага выхаду на чэмпіянат Еўропы, і жаданнем іх заняць другое месца ў групе і ў выніку пасеву атрымаць больш слабых сапернікаў. А можна — нашу другую запар перамогу ў адборачным цыкле, якая і ў мінулыя часы была рэдкасцю, аптымістычна разглядаць як пачатак новага шляху, які абяцаў Бернд Штанге.

У азнаменаванне завяршэння адборачнага цыкла галоўны трэнер беларускай дружыны заявіў, што пара эксперыментаў са складам завершана канчаткова і беспаваротна. Праз колькі дзён трэнерскім штабам будзе складзены спіс з 40 футбалістаў, якія будуць пастаянна знаходзіцца ў полі зроку нямецкага спецыяліста і выклікацца ў нацыянальную зборную. У гэтым спісе абавязкова будзе Раман Васілюк — яшчэ адзін адказ удзельнікам кампаніі ў падтрымку лепшага форварда нацыянальнага чэмпіянату.

А наконт перамогі над зборнай Галандыі Бернд Штанге быў няшматслоўны, як і раней — «не трэба эйфарыі». Але балельшчыкам, якім туман не перашкодзіў атрымаць задавальненне ад такой неабходнай перамогі, у той вечар ён застаўся непачутым...

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ТУРНІРНАЕ СТАНОВІШЧА КАМАНД

	Г	В	Н	П	М	А
1. Румынія	12	9	2	1	26-7	29
2. Галандыя	12	8	2	2	15-5	26
3. Балгарыя	12	7	4	1	18-7	25
4 БЕЛАРУСЬ	**12**	**4**	**1**	**7**	**17-23**	**13**
4. Албанія	12	2	5	5	12-18	11
5. Славенія	12	3	2	7	9-16	11
7. Люксембург	12	1	0	11	2-23	3

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Віталь БУЛЫГА:

«СВОЙ ГОЛ ПРЫСВЯЧАЮ ЎСІМ АМАТАРАМ МЯНЕ ПАКРЫТЫКАВАЦЬ»

Фота Пятра ФАМІНА.

Усе непрыхільнікі футбаліста Віталя Булыгі (*на фота пад № 7*) пасаромленыя: вяртанне ў нацыянальную зборную нападаючага матэрыялізавалася голам у вароты зборнай Галандыі. На развітанне трыбуны «выкупалі» футбаліста ў авацыях — такая яна, увага балельшчыкаў: ад скептыцызму да захаплення — адзін крок.

— Віталь, якія эмоцыі пасля гульні з галандцамі?

— Гэта перамога вельмі патрэбная і, мяркуючы па гульні, — заслужаная. Апошнія два матчы мы правялі на добрым узроўні. Спадзяюся, што ўдалося згладзіць уражанне пасля паражэння ад Люксембурга, і балельшчыкаў на стадыёне цяпер будзе не 10 тысяч, а 30 — як раней.

— Якія ўражанні пакінула зборная Галандыі?

— Натуральна, што датэрміновы выхад на чэмпіянат Еўропы паўплываў на іх настрой — ён у іх быў святочны. У той жа час Ван Бастэн даў шанц праявіць сябе маладым футбалістам, і яны імкнуліся гэта зрабіць. Але нам гэта перамога была больш патрэбная. Зразумела, зборная Галандыі кантралявала ход матча. Наша задача была — абараняцца і лавіць іх на контратаках, што ў нас атрымалася. Сезон скончаны на мажорнай ноце, можна спакойна ісці ў адпачынак.

— Вяртанне ў зборную прынесла станоўчыя эмоцыі?

— Я думаю, кожны футбаліст рады выступаць за нацыянальную каманду. Акрамя таго, прыемна, што наша з Кульчыем і Кутузавым вяртанне супала з перамогамі зборнай.

— Ранейшы канфлікт з Берндам Штанге можна лічыць вычарпаным?

— З галоўным трэнерам у мяне адбылася 40-хвілінная размова праз перакладчыка. Бернд Штанге выказаў свае пажаданні і патрабаванні. І я выконваю, ва ўсякім разе імкнуся выконваць на полі тыя функцыі, якія ён мне даручае.

— Чацвёртае месца нашай зборнай у групе — негатыў ці пазітыў?

— Безумоўна, негатыў. Калі мы абыгралі Галандыю, думаю, маглі б і трэцяе месца заняць. У наступным годзе будзем змагацца за больш высокія месцы.

— У гульні з галандцамі ў вас было асаблівае жаданне даказаць сваю карысць?

— Гэта жаданне ў мяне ёсць заўсёды. Ад мяне патрабуюць галоў гледачы, прэса... Журналісты асабліва мяне «любяць», нават у загалоўкі выносяць. «Не страляйце ў Булыгу» і далей у гэтым жа духу. Свой гол я прысвячаю ўсім аматарам футбола, якія мяне крытыкавалі і крытыкуюць зараз.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

по поручению комиссии по работе с имуществом, обращенным в доход государства, при Борисовском райисполкоме проводят открытый обращенных в доход государства объектов недвижимости:

№ Лота	Наименование объекта	Адрес объекта	Общ. пл. (кв.м)	Начальнаяцена, бел. руб.
1	Гальванический цех	Борисовский р-н, д. Лошница	712	209 850 402
2	Ангар металлический	г. Борисов, ул. Ибаррури, 9	372,5	3 9016 338
3	Гаражный комплекс (боксы 1-6)		406,4	53 601 555

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2007 г. Аукцион состоится 11.12.2007г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. **Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП "Минский областной центр учета недвижимости" УНП 690324015

ISSN 1990 - 763X

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 23.11.2007 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 152,00
1 еўра	3 192,17
1 латвійскі лат	4 567,55
1 літоўскі літ	924,54
1 чэшская крона	119,14
1 польскі злоты	866,27
1 расійскі рубель	88,50
1 украінская грыўня	428,73

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,3174
10 UAH	479927
1000 BYR	11,2757
EUR	36,0895

Курс у гандлёвых кампаніях (на 22.11.2007 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпісцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

Прыёмная кампанія-2008

ЗА ЎДЗЕЛ У ЦТ МОЖА БЫЦЬ УВЕДЗЕНЫ РЭГІСТРАЦЫЙНЫ ЎЗНОС

«Прайшоўшая ўступная кампанія стала важным этапам пераходу сістэмы адукацыі ў стабільны рэжым арганізацыі і правядзення прыёму ва ўстановы, што забяспечваюць атрыманне прафесійнай адукацыі. Правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, зацверджаныя ўказам кіраўніка дзяржавы, прайшлі паспяховую апрабацыю пры правядзенні прыёмных кампаній 2006 і 2007 гадоў і стварылі ўмовы для рэалізацыі прынцыпаў аб'ектыўнасці і сацыяльнай справядлівасці», — аб гэтым на калегіі свайго ведамства заявіў першы намеснік міністра адукацыі нашай краіны Аляксандр Жук.

Разам з тым, захоўваючы ўсе асноўныя палажэнні правілаў прыёму, якія прайшлі праверку часам, было вырашана адкарэктаваць некаторыя пазіцыі з улікам прапаноў Дзяржаўнай камісіі па кантролю за ходам і правядзеннем уступных іспытаў. Распрацаваны ў сценах Міністэрства адукацыі дакумент зараз знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

Так, праектам, у прыватнасці, прадугледжваецца прадаставіць дзецям-інвалідам і інвалідам I і II груп магчымасць удзельнічаць у конкурсе на завочную бюджэтную форму навучання, не маючы практычнага вопыту работы па абранай спецыяльнасці. Справа ў тым, што многія з такіх дзяцей па прычыне фізічных абмежаванняў проста не могуць працаўладкавацца, каб займець неабходны для паступлення стаж работы.

Прапануецца таксама ўдасканаліць і парадак пазаконкурснага залічэння абітурыентаў, каб з году ў год не паўтараліся адны і тыя ж сітуацыі, калі абітурыенты з больш нізкімі баламі ў сертыфікатах не прапускаюць у ВНУ добра падрыхтаваных абітурыентаў. Для прыкладу, сёлета ў Міжнародным экалагічным універсітэце імя А.Д. Сахарава на спецыяльнасці «медыцынская экалогія» на 25 бюджэтных месцаў было пададзена 29 заяў ад абітурыентаў, якія мелі права на залічэнне па-за конкурсам. Пры гэтым астатнія 97 абітурыентаў, якія не карысталіся льготамі, не змаглі нават паўдзельнічаць у конкурсе. Аналагічныя сітуацыі назіраліся таксама на некаторых спецыяльнасцях у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце і Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М. Танка. Таму, не выключана, што ў будучыні так званыя «льготнікі» змогуць карыстацца пераважным правам на залічэнне пры іншых роўных умовах. А галоўным фактарам пры адборы ўсё ж такі веды абітурыентаў...

Акрамя таго плануецца пазбавіць ВНУ права праводзіць уласныя ўступныя выпрабаванні па тых дысцыплінах, па якіх у краіне праводзіцца цэнтралізаванае тэсціраванне. «Мы заўважылі, што правядзенне ўнутрыінстытуцкіх экзаменаў неапраўданае, — патлумачыў Аляксандр Жук, — паколькі пераважная колькасць добра падрыхтаваных абітурыентаў робяць свой выбар на карысць цэнтралізаванага тэсціравання. Маючы на руках сертыфікаты з даволі высокімі баламі, далёка не кожны вырашыцца ўдзельнічаць ва ўнутрыінстытуцкіх экзаменах. Таму ўнутраныя ўступныя іспыты будуць праводзіцца толькі па беларускай і рускай літаратуры, а таксама на спецыяльнасцях, звязаных з творчасцю, фізічнай культурай, і для будучых журналістаў».

Паводле слоў Аляксандра Жука, Міністэрства адукацыі прапануе таксама ўвесці частковую кампенсацыю выдаткаў за арганізацыю і правядзенне цэнтралізаванага тэсціравання. За ўдзел у ЦТ будучыя абітурыенты будуць плаціць так званы рэгістрацыйны ўзнос (прыкладна 10 тысяч рублёў за кожны прадмет), што дазволіць зэканоміць бюджэтныя сродкі і скароціць колькасць маладых людзей, якія не плануюць паступаць, але рэгіструюцца для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні. Сёлета, напрыклад, такіх набралося 30 тысяч чалавек, многія з іх мелі намер проста патрэніравацца — гэта вучні старшых класаў школ. Магчыма, рэгістрацыйны ўзнос павысіць адказнасць моладзі...

Плануецца таксама скараціць на адзін тыдзень тэрміны падачы дакументаў у ВНУ, паколькі адбор ажыццяўляецца фактычна на падставе сертыфікатаў, і завяршаць залічэнне абітурыентаў на ўмовах аплаты не 11, а 4 жніўня. Адпаведна будуць пасунутыя і тэрміны прыёмнай кампаніі ў ССНУ, а ў навучальных установ з'явіцца магчымасць у больш спакойнай абстаноўцы падрыхтавацца да новага навучальнага года. Усе ўжо пераканаліся, што колькі б абітурыентам ні было дадзена часу, многія з іх усё роўна да апошняга дня будуць бегаць паміж прыёмнымі камісіямі розных ВНУ, спрабуючы пралічыць свае шанцы на паступленне. Менавіта па гэтай прычыне Міністэрства адукацыі пакуль адмовілася ад прапановы даць абітурыентам магчымасць за ўласны кошт здаваць на цэнтралізаваным тэсціраванні чацвёртую дысцыпліну. Такім чынам мітусня аказалася б яшчэ большая...

Мяркуецца ўстанавіць аднолькавыя ўмовы для абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у конкурсе на бюджэтную і платную форму навучання. Раней дазвалялася пераносіць дакументы з адной спецыяльнасці на іншую, толькі калі ты ўдзельнічаў у конкурсе на бюджэтнае навучанне. Тыя, хто адразу збіраўся навучацца платна, такога права былі пазбаўленыя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)

ХАРВАТЫ АДМОВІЛІСЯ АД МЕРСЕДЭСАЎ

З прыходам на пасаду галоўнага трэнера футбольнай зборнай Расіі Гуса Хідзінка нашым усходнім суседзям пачало шанцаваць. Склалася ўсё, што было патрэбна для выхаду ў фінальную частку чэмпіянату Еўропы-2008. Расіяне выйгралі ў гасцях у Андоры (1:0), а харваты на «Уэмблі» не пусцілі на кантынентальнае першынство англічан (3:2). Настаўнік родапачынальнікаў футбола Сціў Макларэн быў адпраўлены ў адстаўку. Чатыры лепшыя харвацкія ігракі маглі атрымаць у якасці падарунка за перамогу над канкурэнтамі расіян па пуцёўку на чэмпіянат новенькія мэрседэсы, але адмовіліся ад іх. Ідэя заахвоціць каманду, якая ўжо забяспечыла сабе ўдзел у ЧЕ, шыкоўнымі машынамі, калі яна выйграе ў англічан, прапанаваў віцэ-прэзідэнт нафтавай кампаніі «Лукойл» Леанід Федун. Расіяне ж атрымаюць за выхад у фінальны турнір Еўра па 100 тысяч долараў кожнаму. Жараб'ёўка Еўра-2008 адбудзецца 2 снежня ў Люцэрне (Швейцарыя). 16 зборных падзелены на чатыры карзіны: 1. Аўстрыя, Швейцарыя, Грэцыя, Нідэрланды; 2. Італія, Чэхія, Харватыя, Швецыя; 3. Германія, Партугалія, Іспанія, Румынія; 4. Францыя, Турцыя, Польшча, Расія.

Радасць расіян: харваты захапілі іх з сабой на Еўра-2008.

Ірына ПРЫМАК.

СВОЙ ГОЛ Я ПРЫСВЯЧАЮ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Чаму, на ваш погляд, у другім тайме, дзе не было капітана Глеба, каманда згуляла лепш?

— Трэнер вырашыў даць адпачыць Глебу. У Сашы невялікая траўма, акрамя таго, у яго напрадзе яшчэ шмат гульняў у прэм'ер-лізе, а ў тых, хто гуляе ў расійскім і беларускім чэмпіянатах, сезон завершаны. Бернд Штанге сказаў: дакажыце, што можаце згуляць без Глеба. Хоць адсутнасць Сашы для нас — сур'ёзная страта ў любой гульні. Магчыма, калі б ён згуляў у другім тайме, мы б і чатыры мячы забілі...

— Вось-вось у вашай сям'і адбудзецца папаўненне. Як адчувае сябе жонка?

— Пасля гульні яшчэ не ўключыў тэлефон — магчыма, ужо і нарадзіла. Зараз адразу паеду дадому ў Магілёў.

— Прыемна было нарэшце пачуць у свой адрас авацыі трыбун стадыёна «Дынама»?

— Прыемна, хутчэй, нават не тое, як балельшчыкі праводзілі, а тое, што я забіў. Да таго ж, 15 снежня заканчваецца кантракт з клубам — хацелася добра выступіць. Цяпер будзем чакаць новых прапаноў...

Алена АЎЧЫННІКАВА.

РУП "Логойский комхоз" (Продавец) совместно с КУП "Минский областной центр учета недвижимости"

проводят открытый аукцион

по продаже зданий, расположенных по адресу: г. Логойск, ул. Победы, 102. в том числе: ЛОТ № 1 -- столярно-мебельный цех № 1 общ. пл. 764, 5 кв.м. Площадь зем. уч. 0, 3180 га. Начальная цена -- 200 000 000 бел. руб. с НДС. ЛОТ № 2 -- здание швейного цеха общ.пл. 265, 4 кв.м. Площадь зем. уч. 0, 0860 га. Начальная цена -- 100 000 000 бел. руб. с НДС. Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО "БПС-Банк", МФО 153001357, КУП "Минский областной центр учета недвижимости", УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 26.12.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 22.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34
Сайт в Интернете: www.rlt.by
КУП "Минский областной центр учета недвижимости" УНП 690324015

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости» проводит открытый аукцион № 3-А-07 на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске для строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

Вид аукциона: открытый (на повышение цены продажи).
Предмет аукциона: право заключения договора аренды земельного участка для строительства капитальных строений (зданий, сооружений).
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 227 от 21.02.2007.

Сведения о предметах аукциона

Номер лота	1	2	3	4	5
Месторасположение земельного участка	ул. Шабаны (микрорайон Шабаны-1)	ул. Геологическая (жилой район «Степянка»)	парк им. Челюскинцев	парк им. Челюскинцев	парк им. Челюскинцев
Целевое назначение	Физкультурно-оздоровительный комплекс с объектами общественного питания и сопутствующей торговли	Центр услуг населению	Аттракцион «Пещера ужасов» (по генплану № 9)	Аттракцион «Виртуальный кинотеатр» (по генплану № 9)	Крытый каток с объектами общественного обслуживания, питания и сопутствующей торговли (по генплану № 17)
Кадастровый номер	500000000002004721	500000000001003701	500000000009003412	500000000009003414	500000000009003413
Площадь, га	0,4793	0,0904	0,0959	0,0703	0,2157
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Земельный участок свободен от застройки. Часть земельного участка площадью 0,1567 га занята не лесной древесной растительностью	Земельный участок свободен от застройки	Земельный участок свободен от застройки, имеются зеленые насаждения	Земельный участок свободен от застройки, имеются зеленые насаждения	Земельный участок свободен от застройки, имеются зеленые насаждения
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	В соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение объекта (согласно перечню, установленному Мингорисполкомом)				
Срок аренды земельного участка	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет	50 лет
Срок заключения договора аренды земельного участка	Договор заключается в 10-дневный срок с даты принятия Мингорисполкомом решения о передаче в аренду земельного участка, но не позже 30 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона (а в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь — протокола о признании аукциона не состоявшимся), после осуществления всех предусмотренных платежей				
Начальная цена права заключения договора аренды земельного участка (в долларах США)	1 409 142	322 728	410 452	276 982	616 938
Размер задатка[1] (в долларах США)	70 457	16 136	20 523	13 849	30 847
Базовая годовая арендная ставка (в долларах США)	50 724	9 682	36 941	24 928	19 828
Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителями (в белорусских рублях)	7 909 460	7 909 460	7 909 460	7 909 460	7 909 460

[1] сумма задатка вносится до установленной даты окончания приема документов для участия в аукционе

Аукцион состоится **26 декабря 2007 года** в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.
Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников.
Для участия в аукционе необходимо представить в адрес УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:
общий пакет документов:
заявление на участие в аукционе установленной формы;
заявление об ознакомлении с материалами лотовой документации и осмотре земельного участка;
заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка в размере 5 процентов от начальной цены лота (в случае участия по нескольким лотам — от начальной цены лота с наибольшей стоимостью);
подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах).
Денежные средства перечисляются на расчетный счет № 3012024570010 в ф-л «БПС-Банк» ОАО по Минской области, код 153001331, 220005 г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, д. 6, УНП 190398583 УП «Минский городской центр недвижимости», в белорусских рублях по курсу, установленному Национальным банком Республики Беларусь на момент внесения денежных средств;
для юридических лиц дополнительно:
нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель).
для иностранных инвесторов дополнительно:
легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса иностранного инвестора в соответствии с законодательством страны происхождения (с заверенным переводом на белорусский (русский) язык); документ о финансовой состоятельности иностранного юридического или физического лица, выданный обслуживающим его банком или иным финансово-кредитным учреждением с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
представители иностранных юридических и физических лиц – легализованную в установленном порядке доверенность с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
кроме того, иностранное физическое лицо предъявляет паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а также его копии
для индивидуальных предпринимателей дополнительно:
нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;
копию паспорта;
представитель индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, копию своего паспорта и паспорта лица, интересы которого представляет;
для физических лиц дополнительно:
копию паспорта;
представитель физического лица – нотариально удостоверенную доверенность, копию своего паспорта и паспорта лица, интересы которого представляет.
При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с организатором аукциона соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения акции

Прием документов для участия в аукционе начинается **с 11.00 26 ноября 2007 года** и заканчивается в **16-00 22 декабря 2007 года.**

Победитель аукциона, а в установленных случаях – участник аукциона, помимо оплаты за право аренды земельного участка, обязан в сроки, указанные в протоколе о его результатах (протоколе о признании аукциона не состоявшимся) и соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, возместить организатору торгов расходы по организации и проведению аукциона, названные в извещении, а также оплатить вознаграждение за проведение аукциона в размере 0,5 процента от определенной в ходе торгов стоимости права на заключение договора аренды земельного участка или от его кадастровой стоимости соответственно.

В случае, если аукцион признан не состоявшимся не менее двух раз в силу того, что заявление на участие в таком аукционе подано одним участником (юридическим лицом, гражданином или индивидуальным предпринимателем), договор аренды земельного участка заключается с этим лицом после внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере его кадастровой стоимости и осуществления расчетов в соответствии с заключенным с организатором торгов соглашением о правах и обязанностях сторон при проведении аукциона.

Участник аукциона, право заключения договора аренды земельного участка которому предоставлено в связи с тем, что аукцион по соответствующему лоту признан не состоявшимся не менее двух раз, в сроки, установленные протоколом о признании аукциона не состоявшимся, возмещает местному бюджету (бюджету г. Минска) стоимость документации, подготовленной для проведения аукциона.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли по курсу, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на момент платежа.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по соответствующим земельным участкам, а также приобретения лотовой документации.

В дни и время, указанные в объявлении, размещаемом на информационном стенде (фойе офиса УП «Минский городской центр недвижимости»: г. Минск, ул. К. Маркса, 39), организатором торгов предоставляется транспорт для обеспечения осмотра земельных участков желающими принять участие в аукционе.

Подавать заявления с комплектом документов на участие в аукционе, а также приобретать лотовую документацию можно по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 4 и № 6.

Контактный телефон + 375 (17) 226 16 72.

КУП «Минский городской центр недвижимости» УНП 190398583

Беларускі транзіт:

ЗРУЧНА, НАДЗЕЙНА, ХУТКА

Транзіт расійскіх грузаў, якія перамяшчаюцца аўтамабільным транспартам праз тэрыторыю Беларусі, сёлета павялічыўся на 27 працэнтаў.

Паводле звестак прэс-службы Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) нашай краіны, дзякуючы мадэрнізацыі тэлекамунікацыйнай інфраструктуры ва ўсіх асноўных аўтамабільных пунктах пропуску інфармацыйны абмен паміж беларускімі і расійскімі мытнікамі стаў значна хутчэйшы. Напрыклад, звесткі аб афармленым у «Казловічах» грузе ўжо праз 30 хвілін атрымлівае расійская мытная служба.

Увогуле, як запэўніў кіраўнік ДМК Беларусі Аляксандр Шпілеўскі падчас нядаўняй міжнароднай канферэнцыі «Шляхі вырашэння праблемы перасячэння пагранічных пунктаў пропуску на захадзе і паўночным захадзе РФ», нашы мытнікі гатовыя абслугоўваць яшчэ большую плынь расійскіх транзітных перавозак. Да таго ж беларуская мытня выступае гарантам хуткага і якаснага аказання паслуг пры праходжанні расійскіх тавараў праз нашу мяжу. Варта адзначыць, што пераарыентацыя плыні расійскіх грузаў у наш бок можа вырашыць праблему чэргаў аўтатранспарту на ўчастку граніцы РФ з краінамі Балтыі. Таму, як падкрэслілі ў прэс-службе ДМК, прапанова кіраўніцтва беларускай мытні была падтрымана мытнымі службамі Расіі, Латвіі і Літвы.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

ВЫПЛАТА АЛІМЕНТАЎ

паводле добраахвотнага пагаднення

Падчас учарашняга пасяджэння сесіі Палаты прадстаўнікоў дэпутаты ўхвалілі ў першым чытанні праект Закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя кодэксы Рэспублікі Беларусь па пытаннях спагнання аліментаў на дзяцей».

Паводле слоў міністра юстыцыі Віктара Галаванава, законапраект дае магчымасць «заключэння паміж бацькамі пагаднення аб утрыманні сваіх непаўнагадовых і маючых патрэбу ў дапамозе непрацаздольных паўнагадовых дзяцей». Заключэнне пагаднення аб выплаце аліментаў «носіць добраахвотны характар і разлічана на высокую культуру ўзаемаадносінаў як асобаў, якія знаходзяцца ў шлюбе, так і былых мужа і жонкі. Прымус з боку дзяржавы да заключэння пагаднення адсутнічае».

Пры недзеяздольнасці таго, хто павінен атрымліваць аліменты і (або) асобы, якая іх павінна выплачваць, пагадненне можа быць заключана паміж законнымі прадстаўнікамі дадзеных асобаў. Паміж непаўнагадовымі асобамі (ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў) пагадненне можа быць заключана са згоды іх законных прадстаўнікоў, а пры іх адсутнасці — са згоды органаў апекі і папячыцельства.

Законапраект вызначае, што форма пагаднення павінна быць пісьмовай. Пры гэтым яно павінна быць заверана натарыяльна. Заверанае пагадненне будзе раўняцца па сваёй выканаўчай сіле да выканаўчага ліста.

Плануецца таксама ўсталяваць законапраектам мінімальны памер аліментаў, якія спаганяюцца ў выпадку адсутнасці пагаднення аб выплаце аліментаў. З працаздольных бацькоў на ўтрыманне аднаго непаўнагадовага дзіцяці ў месяц будзе спаганяцца не менш за 50 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму (БПМ). На ўтрыманне дваіх дзяцей — 75 працэнтаў БПМ. На ўтрыманне траіх і больш — 100 працэнтаў.

Усталяванне мінімальнага памеру сумы аліментаў, паводле слоў Віктара Галаванава, тлумачыцца, у прыватнасці, жаданнем дзяржавы «скараціць выпадкі ўтойвання бацькамі сваіх даходаў у мэтах памяншэння памеру аліментаў». Міністр дадаў, што пры падрыхтоўцы законапраекта да другога чытання па прапанове дэпутатаў мінімальныя сумы могуць быць скарэктаваныя. «Гэта пытанне дыскусійнае. І да другога чытання ў гэтай частцы можна дапрацаваць дакумент».

Законапраект таксама ўстанаўлівае эканамічную адказнасць за несвоечасовую выплату аліментаў. «Пры ўтварэнні запазычанасці па віне асобы, якая абавязана выплачваць аліменты па судовай пастанове, вінаватая асоба выплачвае атрымальніку дадаткова 0,3 працэнта ад сумы нявыплачаных аліментаў за кожны дзень пратэрміноўкі». Акрамя таго, атрымальнік аліментаў будзе мець права спагнаць з вінаватага ў несвоечасовай выплаце аліментаў «усе нанесеныя пратэрміноўкай страты, не пакрытыя няўстойкай».

Адказваючы на пытанні парламентарыяў, Віктар Галаванаў паведаміў, што зараз «вядзецца праца» над тым, каб забараніць выезд за мяжу асобаў, якія ўхіляюцца ад выплаты аліментаў. «Некаторых ужо не выпускаем». Пры гэтым міністр дадаў, што зараз ствараецца «адзіная база даных даўжнікоў».

Учора дэпутаты таксама прынялі да ведама Дэкрэт Прэзідэнта Беларусі ад 29 кастрычніка 2007 года № 5 «Аб унясенні змянення ў Дэкрэт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 чэрвеня 2005 года № 6».

Дэкрэт, у прыватнасці, дае права грамадзянам індэксаваць чэкі «Жыллё» ў выпадку перадорвання чэкаў паміж блізкімі сваякамі, якія маюць права на дарэнне для наступнай індэксацыі, без дадатковых прамежкавых дзеянняў па адмене ў судовым парадку папярэдняй дамовы дарэння і наступнага дарэння блізкаму сваяку.

Сяргей КУЗНЯЦОЎ.

Дзіця ў санаторыі «Рамантыка» загінула з-за халатнасці

Гомельскі раённы суд завяршыў слуханне крымінальнай справы на падставе факта гібелі 11-гадовага хлопчыка, які быў смяротна траўмаваны ў санаторыі «Рамантыка». Няшчасны выпадак адбыўся 12 чэрвеня гэтага года. 11-гадовы хлопчык, гуляючы з аднагодкамі, разбіў шкло дзвярэй, якія размешчаны ў холе, і асколкамі быў смяротна траўмаваны.

Дзяржаўнае абвінавачанне прадставіла ў судзе матэрыялы аб тым, што дзверы былі зашклёныя з парушэннем існуючых нормаў. У дзіцячых установах дапускаецца толькі абрашэчанае шкляное палатно, і гэта патрабаванне не было ўлічана інжынернай службай санаторыя пры ўстаноўцы дзвярэй. Суд першай інстанцыі прыгварыў галоўнага інжынера лячэбніцы да 3 гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання пакарання на працягу двух гадоў. У судзе ўдакладнілі, што асуджаны мае права абскардзіць рашэнне раённага суда.

Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.

Увага! Конкурс «Пекін-2008»

Чытачы нашай газеты маюць шанц паехаць у 2008 годзе ў сталіцу Гульняў XXIX Алімпіяды — Пекін!

Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь сумесна з нашай газетай, а таксама спонсарамі і партнёрамі Алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь: ЗАТ «БелСвіссБанк», ЗП «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», ЗП «Рэстараны «МакДональдс», ЗП «Цэптэр Інтэрнацыянал» ТАА, ЗП «Мабільная лічбавая сувязь» аб'яўляе рэспубліканскі конкурс для юнакоў і дзяўчат Рэспублікі Беларусь 1990—1992 гг. нараджэння, двое пераможцаў якога (юнак і дзяўчына) атрымаюць права з 6 па 26 жніўня 2008 года бясплатна пабываць у Алімпійскім маладзёжным спартыўным лагеры ў Пекіне (Кітай) — сталіцы Гульняў XXIX Алімпіяды, куды падчас Алімпійскіх гульняў прыедуць 600 юнакоў і дзяўчат з 205 краін свету, дзе ёсць Алімпійскія камітэты. Вы ўбачыце цырымонію адкрыцця Алімпійскіх гульняў, эстафету алімпійскага агню, пабываеце ў Алімпійскай вёсцы, пазнаёміцеся з культурай Кітая, ажыццявіце экскурсійны тур па Пекіну, станеце ўдзельнікамі розных маладзёжных міжнародных праграм на тэму спорту і мастацтва.

АБАВЯЗКОВЫЯ ЎМОВЫ ДЛЯ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ КОНКУРСУ
- **свабоднае валоданне англійскай мовай;**
- **узрост на 5 жніўня 2008 года павінен складаць ад 16 да 18 гадоў;**
- **добрае веданне гісторыі сусветнага алімпійскага руху;**
- **наяўнасць высокага ўзроўню ведаў у сферы развіцця і дасягненняў беларускага спорту;**
- **занятак спортам, грамадскай работай.**

■ Конкурс юных знаўцаў «Пекін-2008» праводзіцца ў **пяць тураў з 10 верасня па 10 снежня 2007 г.**
■ У кожным туры прапануецца 10 пытанняў з варыянтамі адказаў (4—5). Кожны правільны адказ — адно заліковае ачко.
■ У кожным туры публікуецца спецыяльны купон, у якім удзельнікі конкурсу павінны напісаць правільныя варыянты адказаў.
■ Пераможцамі становяцца ўдзельнікі, якія набралі найбольшую колькасць ачкоў і паспяхова прайшлі **гутарку на англійскай мове** ў Нацыянальным алімпійскім камітэце Рэспублікі Беларусь на тэмы развіцця беларускага спорту і сусветнага алімпійскага руху.
■ Кожны ўдзельнік мае права выслаць толькі **адзін варыянт адказу** — запоўнены арыгінал-купон, выразаны з газеты. (Ксеракопіі не прымаюцца.)
■ Купон высылаецца на працягу 7 дзён пасля публікацыі (правяраецца па паштоваму штэмпелю на канверце) на адрас: вул. Я. Коласа, 2, г. Мінск, 220005, Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь **з паметай: «Конкурс «Пекін-2008» і ўказаннем нумара тура на канверце**.
■ Удзельніку, які ўпершыню выслаў купон, неабходна таксама ўкласці ў пісьмо ксеракопію старонкі пашпарта (дзе маецца фатаграфія і дата нараджэння).
■ Пераможцы і прызёры конкурсу атрымаюць памятныя дыпломы НАК Беларусі, пуцёўкі ў Пекін і прызы ад фірмаў-спонсараў конкурсу.
■ У выпадку, калі два ці больш удзельнікаў набяруць роўную колькасць балаў, пераможцу вызначае жэрабёўка.

Палажэнне аб конкурсе «Пекін-2008» на сайце www.noc.by.

Пытанні IV тура

1. Упершыню выступаючы на Алімпійскіх гульнях баскетбалісты Кітая атрымалі толькі адну перамогу ў 4 матчах. Хто быў пераможаны?
1 — Бразілія 3 — Філіпіны 5 — Японія
2 — Перу 4 — Францыя

2. У якім відзе спорту спартсмены Кітая заваявалі больш за ўсё залатых медалёў на Алімпійскіх гульнях 1984 года?
1 — гімнастыцы
2 — скачках у ваду
3 — стральбе кулявой
4 — цяжкай атлетыцы
5 — гімнастыцы і цяжкай атлетыцы пароўну

3. У якіх відах спорту па стану на 19 лістапада 2007 г. спартсмены Беларусі заваявалі права выступіць на Алімпійскіх гульнях у Пекіне максімальна магчымым складам па колькасці ўдзельнікаў?
1 — гімнастыцы спартыўнай і мастацкай
2 — гімнастыцы мастацкай і веласпорце на шасэ
3 — гімнастыцы мастацкай і цяжкай атлетыцы
4 — скачках на батуце
5 — стральбе кулявой і цяжкай атлетыцы

4. У якім горадзе нарадзіўся алімпійскі чэмпіён Камандар Маджыдаў?
1 — Агдам 3 — Дманісі 5 — Сумгаіт
2 — Баку 4 — Мігнечаур

5. Колькі разоў чэмпіёнам свету станавіўся вясляр Віктар Рэнейскі?
1 — 2 2 — 4 3 — 6 4 — 8 5 — 10

6. Беларускі сабліст Віктар Сідзяк у складзе каманды СССР заваяваў званне чэмпіёна ў індывідуальных спаборніцтвах на Алімпіядзе 1972 года, атрымаўшы ў фінальным турніры 4 перамогі ў 5 баях. Каму ён саступіў у фінальным турніры шасцёркі мацнейшых?
1 — Тамашу Ковачу (Венгрыя)
2 — Петэру Мароту (Венгрыя)
3 — Мікеле Мафеі (Італія)
4 — Уладзіміру Назлымаву (СССР)
5 — Рэжы Бонісану (Францыя)

7. У якім горадзе нарадзіўся беларускі алімпійскі чэмпіён Валерый Шарый?
1 — Валожыне 4 — Маладзечне
2 — Дзяржынску 5 — Чэрвені
3 — Капылі

8. Першы алімпіец беларускай зямлі Кароль Румель удзельнічаў у Другой сусветнай вайне і закончыў яе ў званні...
1 — сяржанта 4 — палкоўніка
2 — маёра 5 — генерала
3 — падпалкоўніка

9. На Алімпійскіх гульнях 2004 г. у складзе мужчынскай баскетбольнай зборнай Кітая найбольшы час на пляцоўцы ў сярэднім за матч правёў...
1 — GUO Shiqianq 4 — YAO Minq
2 — SUN Jun 5 — WANG Zhizhi
3 — HU Weidonq

10. Якая сустрэча праходзіла ў Мінску ў матчы 1/4 фіналу футбольнага турніру Алімпіяды-1980?
1 — ГДР—Ірак
2 — Коста-Рыка—Нігерыя
3 — СССР—Кувейт
4 — Чэхаславакія—Куба
5 — Югаславія—Алжыр

Адказы на пытанні II тура

1. МАК афіцыйна прызнаў НАК Кітая ў 1979 годзе. *Адказ № 4.* (Даныя МАК).
2. Часцей за ўсё спартсмены сумяшчаюць выступленні ў веласпорце летам і канькабежным спорце зімой. *Адказ № 1.*
3. Чыстая перамога ў дзюдо называецца «іпон». *Адказ № 2.*
4. Са спартсменак-легкаатлетак найбольшы перыяд часу паміж заваяванымі алімпійскімі медалямі — 16 гадоў — у Мерлін Оці. У яе актыве ёсць медалі як Алімпіяды 1980, так і 1996 года. *Адказ № 5.*
5. Шырыня верхняй часткі гімнастычнага бервяна 10 см. *Адказ № 2.*
6. Алімпійскі чэмпіён Аляксандр Масяйкоў нарадзіўся ў Магілёве. *Адказ № 4.*
7. На Алімпійскіх гульнях 2004 г. спартсмены Кітая заваявалі медалі ў 20 відах спорту. *Адказ № 5.*
8. Фехтавальшчыца Алена Бялова на Алімпійскіх гульнях атрымала 100 перамог у 133 баях. *Адказ № 5.*
9. 112-я сесія МАК 2001 г., на якой было прынята рашэнне, што сталіцай Алімпійскіх гульняў 2008 г. стане Пекін, праходзіла ў Маскве. *Адказ № 4.*
10. Першым прэзідэнтам МАК быў Дэметрыёс Вікелас. *Адказ № 1.*

Сярод хлопцаў пасля 2-х тураў з максімальным вынікам лідзіруюць мінчанін *Фёдар КАНДЗІБОР* і *Уладзіслаў ПЯТРУХІН* з Віцебска. Сярод дзяўчат 19 ачкоў з 20 магчымых мае *Таццяна КУЦКО* з Івацэвіч. На 1—2 ачкі ад лідараў адстаюць 27 юнакоў і 12 дзяўчат.

Прозвішча, імя, імя па бацьку (*без скарачэнняў*)
Год нараджэння | Тур № 4 | Тэлефон
Хатні адрас
Пытанні
Адказы (лічбы)

З глыбокім жалем калектыў «Звязды» ўспрыняў вестку пра смерць Мікалая Віктаравіча СІДАРОВІЧА, колішняга намесніка галоўнага рэдактара газеты. У «Звяздзе» ён пакінуў добрую памяць пра сябе — выказваўся высокім прафесіяналізмам, уменнем працаваць у калектыве, добразычлівым стаўленнем да калег, павагай да поглядаў і перакананняў іншага чалавека. Умеў прыйсці на дапамогу ў патрэбную хвіліну, падтрымаць парадай, падказаць цікавую тэму. Выказваем самыя шчырыя спачуванні яго родным, блізкім і сябрам.

Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Надзвычайнаму і Паўнамоцнаму Паслу Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Германія Скварцову Уладзіміру Мікалаевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

23
ЛІСТАПАДА
2007 г.
ПЯТНІЦА
№ 48 (15499)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

СТУДЭНЦКАЯ СПАРТАКІЯДА

Спартакіяда студэнтаў сталічных ВНУ прайшла на базе спартыўна-аздараўленчага комплексуа БДУ «Брыганціна» ў гарадскім пасёлку Радашковічы пад Мінскам.

Першае месца на спартакіядзе заваявала ў агульнакамандным заліку каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Другое месца — студэнты БДЭУ, а трэцяе месца — каманда Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Удзел у спартакіядзе ўзялі студэнты васьмі сталічных вышэйшых навучальных установ. Спаборніцтвы праводзіліся па пяці відах спорту: валейболу, міні-футболу, настольнаму тэнісу, плаванню і шахматах. Спартакіяда праходзіла ўжо ў трэці раз, а яе арганізатарамі выступілі Рэспубліканскі прафесійны саюз работнікаў вышэйшай школы і Беларускі дзяржаўны ўніверстэт.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Навучэнцы Клічаўскага аграрна-тэхнічнага каледжа ў вольны час займаюцца цяжкай атлетыкай. На першым плане — будучы энергетык Раман ЛАПКО.

Капітальны рамонт патрабуецца кожнаму пятаму аздараўленчаму лагеру

Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя падвёў вынікі летняй аздараўленчай кампаніі.

Як паведаміла журналісту «Звязды» загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала Малахава, усяго аздараўленнем былі ахоплены больш за 455 тыс. дзяцей, прычым прыкладна палова з іх аздараўліваліся ў лагерах з кругласутачным знаходжаннем. На жаль, але сетка стацыянарных аздараўленчых лагераў працягвае штогод скарачацца. Не стаў выключэннем і гэты год — усяго былі зачынены 20 лагераў: 9 лагераў знаходзяцца ў наваколлі сталіцы, 3 — у Магілёўскай вобласці і па 2 лагеры — у Гродзенскай, Віцебскай, Брэсцкай і Гомельскай абласцях. А ўсяго, пачынаючы з 90-х гадоў, дзятва пазбавілася ўжо 115 лагераў, матэрыяльная база якіх прыйшла ў непрыдатны стан і не магла далей выкарыстоўвацца для адпачынку і аздараўлення школьнікаў. Нягледзячы на гэту акалічнасць, колькасць дзяцей, якія прайшлі аздараўленне, у апошнія гады не змяншаецца — для гэтых мэтаў сёлета былі задзейнічаны дадаткова 48 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый для дарослых, а таксама санаторныя школы-інтэрнаты, агульнаадукацыйныя ўстановы, турыстычныя базы і воінскія часці.

Трэба заўважыць, што па прадпісаннях дзяржаўнага санітарнага нагляду, пры падрыхтоўцы да аздараўленчага сезона-2007 матэрыяльна-тэхнічная база 41 лагера была палепшана. Разам з тым з 210 стацыянарных лагераў, якія функцыянавалі сёлета, 43 патрабуецца капітальны рамонт для таго, каб прыняць дзяцей будучым летам. Па-ранейшаму не ўсе лагеры забяспечаны цэнтральным ацяпленнем жылых будынкаў.

— На працягу двух апошніх гадоў з бюджэту выдзяляецца дастаткова сродкаў для забеспячэння паўнавартаснага харчавання дзяцей у лагерах, — падкрэсліла Ала Малахава. — Да таго ж санэпідслужбе ўдалося дабіцца ўкамплектавання харчовых блокаў кваліфікаванымі поварамі, асноўнае месца работы якіх — установы адукацыі для дзяцей і падлеткаў. На працягу ўсяго аздараўленчага сезона якасць харчавання дзяцей кантралявалася з выкарыстаннем лабараторных метадаў абследавання.

Асаблівая ўвага ў аздараўленчым сезоне надавалася таксама ўкамплектаванню медыцынскімі кадрамі і максімальнаму аздараўленню дзяцей з хранічнымі захворваннямі. Дзеці і падлеткі, якія знаходзяцца на дыспансэрным уліку, атрымлівалі полівітаміны і фітагарбату. Тры апошнія гады па прапанаваных санэпідслужбай крытэрыях праводзіцца ацэнка эфектыўнасці аздараўленчай кампаніі: у прыватнасці, робіцца ацэнка стану дыхальнай, сардэчна-сасудзістай сістэм, мышачнай сілы дзіцяці і г.д. напярэдадні і пасля завяршэння адпачынку. У гэтым годзе ў загарадных аздараўленчых лагерах з кругласутачным знаходжаннем выражаны аздараўленчы эфект назіраўся ў 81,4 працэнта дзяцей, у 16 працэнтаў дзяцей была адзначана наяўнасць слабага аздараўленчага эфекту і толькі ў 2,7 працэнта дзяцей аздараўленчы эфект увогуле адсутнічаў.

У ходзе нагляду за падрыхтоўкай і правядзенням летняй аздараўленчай кампаніі да адміністрацыйнай адказнасці былі прыцягнуты 838 чалавек і вынесены 76 пастаноў аб закрыцці ці прыпыненні эксплуатацыі аздараўленчых лагераў. Прычыны самыя розныя — гэта і аварыйныя сітуацыі ў сістэмах водазабеспячэння, і паломкі халадзільнага абсталявання, і неабходнасць правядзення на харчблоках генеральнай уборкі. На працягу ўсяго аздараўленчага сезона прыпынялася эксплуатацыя 45 аздараўленчых лагераў з дзённым знаходжаннем дзяцей.

Адразу пасля завяршэння летняй аздараўленчай кампаніі 2007 года распачалася падрыхтоўка да новай. Тэрытарыяльнымі органамі санэпіднагляду былі выдадзены прадпісанні і плануюцца заданні па пытаннях умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы загарадных аздараўленчых лагераў — для таго, каб своечасова прывесці іх у адпаведнасць з патрабаваннямі санітарным нормаў і правілаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Лідарскі дар

СТУДЭНТ-БІЗНЭСМЕН

Паспяховы праграміст, кіраўнік не менш паспяховага прадпрыемства ў сферы інфармацыйных тэхналогій, распрацоўшчык камп'ютарнай гульні — гэткага беларускага адказу ваенным стратэгіям тыпу «StarCraft» і «WarCraft-3», рэзідэнт Парка высокіх тэхналогій... Спіс даволі вялікі, асабліва калі ўлічыць, што ўсё гэта пра 22-гадовага студэнта факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Вось такі ён наш сённяшні герой — студэнт-бізнэсмен — Максім ОСІПАЎ.

Ёсць людзі, якія літаральна выпраменьваюць дабрыню ці бадзёрасць, абаяльнасць ці пазітыўнасць, у дачыненні да Максіма гэта будзе дзейнасць: тэмп яго размовы такі хуткі, што здаецца, скіраваны на тое, каб эканоміць час (а як інакш размаўляць, калі столькі спраў), аднак і словы, відаць, не паспяваюць за думкамі, якія праносяцца яшчэ шпарчэй. Планы яго такія грандыёзныя, што невялікі офіс падаецца яшчэ меншым, чым ёсць на самай справе, — прасторы для энергіі і запалу Максіма тут відавочна не хапае. З яго энтузіязмам можна горы звярнуць, што ён і спрабуе зрабіць. У астатніх людзей пры гэтым узнікае вера ў магчымасць уласных поспехаў — выпрабавана на сабе. Працаваць, працаваць і яшчэ раз працаваць — такое крэда ў Максіма Осіпава. Калі вы, шаноўныя сябры, на гэта гатовыя, можаце чытаць далей — і даведаецеся, як рэалізаваць свае лідарскія якасці, пачаць уласную справу, развіць яе і дабіцца поспеху. Парады ад Максіма Осіпава:

— Першае і галоўнае, трэба самому паверыць у тое, што адкрыць сваю справу рэальна. Ніхто не кажа, што гэта лёгка, аднак пры пэўных намаганнях магчыма. Па-другое, быць гатовым аддаваць гэтаму шмат сілаў: адпачываць і ўдзень, і ўвечары, і па выхадных і пры гэтым мець прыбытак — не атрымаецца. Па-трэцяе, мець хоць які-небудзь стартавы капітал і быць гатовым з ім развітацца. Улічваючы ўсе гэтыя фактары, відавочна, што кар'еру лепш пачынаць маладым: пакуль няма адказнасці за сям'ю і можна смела эксперыментаваць, нават рызыкаваць. Мне яшчэ са школы хацелася займацца камп'ютарнымі гульнямі і адкрыць менавіта ўласнае прадпрыемства такога плана. Я тады ўдзельнічаў у міжнародных алімпіядах па праграмаванні, вяртаўся з медалямі і адчуванне у сабе сілаў для працы. Грашовыя прэміі капіў, потым яны і сталі пачатковым капіталам для фірмы, хоць гэта і было ўсяго некалькі тысяч долараў. Але пачынаў я без юрыдычнага афармлення, проста нешта сам пісаў, потым падключыў таварышаў.

Людзі прыходзілі і сыходзілі, у розныя гады над гульнёй працавала восем праграмістаў, дызайнер, кампазітар, які пісаў музыку пад заказ. Тэсціраванне гульні стала магчымым дзякуючы энтузіязму геймераў, якія хацелі дапамагчы ў распрацоўцы беларускай гульні — тэсціраванне праходзіла і ў адным з мінскіх камп'ютарных клубаў (толькі фінальны этап прайшоў у Маскве). Відавочных поспехаў праекта не было, як і шматабяцальных перспектыў, але Максім сваю працу ўпарта працягваў, з цягам часу арандаваў офіс, адкрыў фірму «VironIT», нават знайшоў інвестара, а сёлета вось удалося стаць рэзідэнтам Парка высокіх тэхналогій (ПВТ). Калі вы, нашы шаноўныя чытачы, звязваеце свае будучыню са сферай высокіх тэхналогій і плануеце працаваць у гэтым накірунку, вам няблага было б даведацца, як стаць рэзідэнтам Парка і што гэта дае.

— Ёсць некалькі патрабаванняў да рэзідэнтаў: трэба прэзентаваць канкрэтны праект, які ваша прадпрыемства плануе рэалізаваць, пры ўмове, што праект інавацыйны, навукаёмісты і прадукцыя можа пайсці на экспарт. Да праекта, зразумела, трэба прыкласці падрабязны бізнэс-план. У фірмы павінна быць хоць нейкая гісторыя: «VironIT», напрыклад, на момант уступлення ў Парк працавала каля года. Трэба, каб бухгалтэрыя была празрыстай: зарплаты налічваюцца рэальна, а не ў канверт. Рэзідэнцтва дае сур'ёзныя льготы па падатках: мы плацім іх у некалькі разоў менш, чым звычайныя прадпрыемствы — наколькі я ведаю, такой палёгкі няма больш нідзе ў краіне. Акрамя таго, ПВТ — гэта прэстыжны брэнд, якому давярае патэнцыйны заказчык: мы не проста нейкая шарашка, а рэзідэнты Парка высокіх тэхналогій. Акрамя таго, для рэзідэнтаў Парка прадугледжаны скідкі для ўдзелу ў канферэнцыях, выстаўках і іншых мерапрыемствах. Тут акумулюецца ўся інфармацыя ў нашай галіне, праводзяцца тэндары на распрацоўку праграмнага забеспячэння. А вясной-летам чакаецца адкрыццё ўласнага будынка ПВТ, дзе арэнда і карыстанне Інтэрнэтам будуць таннейшымі.

Што ж, умовы для прадуктыўнай працы ў кампаніі «VironIT» ёсць і нават будуць паляпшацца. Пяройдзем да саміх вынікаў.

— Наша гульня, мы назвалі яе «Маўчанне» (у рускім варыянце «Безмолвие»), — гэта стратэгія рэальнага часу, якіх напісана многа, і геймерам, зразумела, хацелася б бачыць нешта новае, незвычайнае — мы паспрабавалі ім гэта даць, ажывіць гульню незвычайнымі і прынцыпова новымі дэталямі. Прынамсі, стаўку рабілі не на графіку (хоць гульня выглядае прывабна і так) — прыгожае, але нецікавае хутка надакучвае, а на правілы, на сам гейм-плэй. Калі ў звычайных гульнях дзеянне адбываецца на плоскай карце, то ў нас на шары — на аб'ёмнай планеце, — пакуль аналагаў гэтаму ў такім жанры не існуе. Дзеянне адбываецца ў трохмернай прасторы. Танчыкамі, самалёцікамі, усімі ваеннымі рэсурсамі гулец кіруе з вышыні птушынага палёту. Там ёсць розныя рэсурсы, можна зарабляць грошы і траціць іх на новую тэхніку. Мы распрацавалі шматкарыстальніцкі рэжым, каб была магчымасць гуляць па сетцы. Новае і тое, што да гульні можна падключыцца ў любы момант. Гэта асаблівасць пацягнула за сабой іншыя: каб чалавек, які падключыўся праз гадзіну, не адставаў па рэсурсах, прадугледжаны такія правілы, паводле якіх ён дастаткова хутка змог бы дагнаць астатніх гульцоў. Так што гульня наша не на развіццё, а на хуткасць дзеянняў. Перамога вызначаецца па колькасці тэрыторый, якія кантралююцца, таму гуляць можна даволі доўга: нават згубіўшы войска, вы не выбываеце — толькі калі згубілі ўсе тэрыторыі. Такое ў стратэгіях вельмі рэдка выкарыстоўваецца.

Гульня гульнёй, а бізнэс бізнэсам — як і дзе «Маўчанне» будзе рэалізоўвацца?

— Мы падпісалі кантракт з выдаўцом — кампаніяй «Бука», адной з самых буйных на рынку СНД. Гульню ім здалі 9 лістапада, там яна дрыкуецца і распаўсюджваецца па пунктах рознічнага гандлю. 22 лістапада «Безмолвие» з'явілася на прылаўках не толькі ў Беларусі, але і на ўсёй тэрыторыі СНД і краін Балтыі. Паводле кантракта з выдаўцом, правы на гульню для нашай кампаніі застаюцца на ўсе тэрыторыі, акрамя СНД і краін Балтыі. У далейшым мы плануем асвойваць рынак заходніх краін, для гэтага нам трэба будзе прадаставіць толькі пераклад на англійскую мову (англамоўная версія, хутчэй за ўсё, будзе называцца «The time of silence» — «Час маўчання»), а агучваць будуць самі носьбіты мовы — атрымаецца больш якасна. На працягу паўгода спадзяёмся знайсці заходніх выдаўцоў і разлічваем на далейшы прыток інвестыцый.

На некалькі тыдняў перад самай здачай праекта Максім Осіпаў наогул забыўся на сон, аднак зацягваць з выхадам гульні не хацелася — у гэтым быў свой бізнэс-разлік: пераднавагодні перыяд — час «шопінгавай ліханкі», калі людзі скупляюць літаральна ўсё. Такі шанц упускаць было нельга: гэта ж толькі зараз кампанія «VironIT» атрымала аванс паводле кантракту і пачне атрымліваць прыбыткі ад продажаў, а дагэтуль прыбытку не было наогул...

Рызыка была вялікая, спачатку ўкладваў уласныя грошы, потым знайшоў інвестара, але ён фінансаваў нас далёка не ўвесь час працы над гульнёй... Мы пастаянна дапрацоўвалі, паляпшалі гульню, а дамоўленасць з выдаўцом так і не станавілася акрэсленай. Рахункі за тэлефонныя перамовы прыходзілі велізарныя, а выніку ўсё не было... Проста парог уваходу ў гэту індустрыю вельмі і вельмі высокі: калі гульню давялі практычна да фінальнага выгляду, тады толькі выдавец быў гатовы з мінімальнай рызыкай для сябе ўкладваць грошы ў гэты праект. Да фіналу дайшлі нямногія з тых, хто пачынаў працаваць над гульнёй, на сёння нас пяцёра, калі лічыць і мяне. Вось, пазнаёмцеся, наш праграміст Лёша Толсцікаў і бухгалтар Галіна Уладзіміраўна, дарэчы, мая мама.

Сама Галіна Уладзіміраўна поспехам маладога кіраўніка, вядома ж, радуецца, аднак і пашкадаваць, як усе матулі, не забывае — для яе важней, каб дзіцяці жылося лёгка і шчаслива, гары яны гарам тыя поспехі...

— Надта ўжо шмат ён працуе, — кажа жанчына і цяжка ўздыхае.

А сыну і сапраўды не да адпачынку:

— Здавался б, праект здаў, можна крыху расслабіцца... Не, як толькі праект рэалізаваўся, я ўпэўніўся, што можна зрабіць яшчэ больш.

Так і не спыняецца праца-праца-праца Максіма — зараз ідуць перамовы з адной з беларускіх ВНУ наконт распрацоўкі адукацыйнай праграмы для студэнтаў, ужо ёсць заказ на дапаможнік па правілах дарожнага руху — да ўсіх гэтых праектаў у маладога лідара жвавы, непадробны інтарэс:

— У нашым віртуальным саманастаўніку па правілах дарожнага руху будзе вельмі арыгінальная падача, ніякіх статычных малюнкаў. Дэталі пакуль буду трымаць у сакрэце, скажу толькі, што аналагаў пакуль няма і, спадзяюся, да выхаду саманастаўніка ў свет не будзе. Плануем таксама зрабіць працяг гульні: у «Маўчанні» наш патэнцыял быў не поўнасцю рэалізаваны, там можа гуляць максімум дванаццаць удзельнікаў, у наступнай версіі мы хочам гэту колькасць істотна павялічыць. Ёсць ідэі наконт малых гульняў тыпу «Zuma», так званых casual games (лёгкія гульні) — больш прывабных для дзяўчат, у адрозненне ад «Маўчання», арыентаванага на 15—25-гадовых хлопцаў. Прынамсі casual games больш хуткія ў распрацоўцы, а гэта важна для таго, каб дынамізаваць абароты грошай. З першым праектам я не падгадаў тэрміны: разлічваў на год-паўтара, а атрымалася ўсяго на два месяцы менш за Другую сусветную вайну. Зараз будзем адсочваць рэакцыю на гульню, для нас асабліва важная ацэнка менавіта беларускіх геймераў, ну і ўзровень продажу.

Кіраўнік кампаніі па-ранейшаму шмат праграмуе, аднак усё больш адчувае патрэбу ў тым, каб наняць замест сябе праграміста і вызваліць тым самым час для бізнэс-планавання. Паралельна Максім праходзіць перападрыхтоўку ў Інстытуце бізнэсу і менеджменту тэхналогій БДУ. Для таго каб усё паспяваць, Максіму даводзіцца працаваць-вучыцца часам нават па 12—14 гадзін у суткі. А якія яшчэ якасці, акрамя неверагоднай працавітасці, патрэбны маладому лідару?

— Упартасць, настойлівасць і вера ў сябе нават у самыя цяжкія хвіліны, калі здаецца, што нічога не атрымаецца і трэба кідаць. Не варта быць даверлівым прастаком, трэба ўмець арыентавацца ў розных жыццёвых сітуацыях, тут мне вельмі дапамог бацька — ён мой першы дарадца. Падатковай спуску не даваць, ведаць бездакорна сваю справу і ўсё, што яе датычыць. Мне, напрыклад, давялося дасканала вывучыць аўтарскае права — мы ж маем справу з інтэлектуальнай уласнасцю.

Скепсісу ад заказчыкаў у адносінах да сябе малады кіраўнік асабліва не адчувае, а калі нешта падобнае і ўзнікае пры першай сустрэчы, то ў працэсе працы заўсёды праходзіць. І праўда, калі чалавек у сваёй справе мае хоць нейкія поспехі, гэта ўжо нагода яго паважаць. Поспехі ў Максіма Осіпава, безумоўна, ёсць, а галоўнае ёсць мноства ідэй, планаў і проста прыкідак. Ці ёсць аб чым шкадаваць?

— Хіба што аб тым, што студэнцкага жыцця я так і не адчуў: ні табе бесклапотнага адпачынку, ні святаў — толькі сесіі здаваў, так і прайшлі мае студэнцкія гады — за вучобай ды працай. Дарэчы, якраз на першым курсе я і пачаў распрацоўваць гульню, і вось бачыце, толькі на пятым убачыў яе ў продажы.

Хочацца, каб такія маладыя і перспектыўныя кіраўнікі, як Максім, ні аб чым не шкадавалі, азіраючыся назад, а глядзелі ў будучыню і марылі, лепш нават складалі планы, і каб час ад задумы да рэалізацыі іх быў як мага карацейшы.

Ала МАЧАЛАВА.

Наш фармат

ПАЛОВА ПУЦЁВАК У ПАЎФІНАЛ — У БЕЛАРУСАЎ

Права ўдзельнічаць у паўфінале сусветных спаборніцтваў па праграміраванні сярод студэнтаў па правілах АСМ заваявалі па дзве каманды ад Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Універсітэта імя Эмануіла Канта (г. Калінінград), Вільнюскага ўніверсітэта і па адной камандзе — ад Латвійскага ўніверсітэта, Каўнаскага тэхнічнага і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэтаў.

Нагадаем, што чвэрцьфінал сусветных спаборніцтваў праходзіў у Мінску, у сценах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе за права трапіць у паўфінал змагаліся 47 камандаў з 20 універсітэтаў Беларусі, Калінінградскай вобласці Расіі, Літвы, Латвіі і Эстоніі.

Кожная каманда складалася з трох удзельнікаў. У ходзе асноўнага тура ім трэба было рашыць 9 задач па праектаванні алгарытмаў і праграм. Пратакол спаборніцтваў, які адлюстроўваў ход праверкі рашэнняў, транслявався на праекцыйнай панэлі ў холе галоўнага корпуса БДУ, а таксама на праекцыйных экранах на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і механіка-матэматычным факультэце. У ходзе чэмпіянату адбыліся майстар-класы вядучых IT-камп-паній для ўсіх ахвотнікаў. Акрамя таго, студэнты-праграмісты, якія шукаюць сабе работу, маглі азнаёміцца з вакансіямі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

БЛІСКУЧАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА ФЛІКЕРУ

Дзяржаўтаінспекцыя сталічнай вобласці прапануе яшчэ адзін эфектыўны спосаб папярэджвання дарожна-транспартных здарэнняў у цёмны час сутак.

Як паведаміла старшы інспектар упраўлення ДАІ УУС Мінаблвыканкама Анжэліка ВЫДЖАК, «даішнікі» сталічнай вобласці зацікавіліся замежным перадавым вопытам. У прыватнасці, увагу нашых міліцыянераў прыцягнуў спецыяльны празрысты святлоадбівальны лак французскай вытворчасці, які забяспечвае бачнасць пазначаных прадметаў у цёмны час сутак. Беларускія «даішнікі» правялі эксперымент. Спачатку нанеслі лак на аўтатрактарную тэхніку, веласіпеды і гужавы павозкі, шлагбаўмы і бетонныя агароджы. Ужо праз 5 хвілін (роўна столькі часу высыхае лак) гэтыя транспартныя сродкі і аб'екты святліліся ў цемры і былі бачны на даволі вялікай адлегласці. Потым, вырашылі «праэксперыментаваць» на жывых людзях. Дакладней, памянёным лакам нанеслі адмысловыя знакі на верхняе адзенне і абутак. Адметна, што гэтае рэчыва не псуе апрацаваную паверхню і пры дзённым святле амаль нябачнае. Затое ў цемры чалавек з «лакіраваным» абуткам ці вопраткай свеціцца як навагодняя ёлка, а значыць можа адчуваць сябе больш бяспечна на дарозе.

Такім чынам на думку «даішнікаў» Мінскай вобласці, эксперымент прайшоў паспяхова. І зараз вырашаецца пытанне аб набыцці памянёнага лаку для міліцэйскіх падраздзяленняў, якія нясуць службу ў цёмны час сутак. ДАІ спадзяецца, што і кіраўнікі цывільных арганізацый і ўстаноў, якія клапоцяцца аб бяспецы сваіх падначаленых, таксама зацікавяцца бліскучай альтэрнатывай флікеру.

Мікола ДЗЯБЁЛА.

Ведай нашых!

МАКСІМУМ БЕЛАРУСКІХ ШКОЛЬНІКАЎ

Проста бліскуча выступілі беларускія школьнікі на IV алімпіядзе школьнікаў краін СНД і Балтыі па агульнаадукацыйных прадметах.

Усяго ўдзел у алімпіядзе ўзялі каля 300 дзяцей з 14 краін. Гонар беларускай школы адстойвалі 20 вучняў 10—11 класаў, якія ўжо перамагалі на аналагічных рэспубліканскіх інтэлектуальных спаборніцтвах. Дарэчы, некаторыя з іх пазней прызнаваліся, што ў параўнанні з рэспубліканскай алімпіядай заданні алімпіяды школьнікаў краін СНД і Балтыі не падаліся ім вельмі складанымі.

У гэтым годзе беларускія школьнікі дэманстравалі свае веды па пяці прадметах: рускай мове і літаратуры, матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі. І па ўсіх пяці дысцыплінах яны сталі абсалютнымі пераможцамі, гэта значыць, што нашы дзеці набралі максімальную колькасць балаў сярод усіх удзельнікаў. Усяго ж на рахунку беларускіх школьнікаў — 15 дыпломаў, у тым ліку 8 дыпломаў I ступені, тры дыпломы II ступені і чатыры дыпломы — III ступені. Вельмі істотны ўклад у агульнакамандны поспех зрабілі прадстаўнікі Ліцэя БДУ і сталічнай сярэдняй школы № 51.

Дыпломы I ступені заваявалі: па рускай мове — Юля Заверач (10 клас, СШ № 14 г. Брэста), па матэматыцы — Арцём Тоесцеў (10 клас, Ліцэй БДУ) і Дзмітрый Каханоўскі (10 клас, Бараўлянская гімназія), па фізіцы — Ягор Ганчароў (11 клас, СШ № 51 г. Мінска) і Дзмітрый Пратасеня (11 клас, Ліцэй БДУ), па хіміі — Людміла Буданіцкая (10 клас, СШ № 51 г. Мінска) і Павел Чулкін (11 клас, Ліцэй БДУ) і па біялогіі — Арцём Маргуноў (10 клас, Ліцэй БДУ).

Дыпломы II ступені — у Антона Дашкевіча (фізіка, 10 клас, СШ № 51 г. Мінска), Юліі Герасімчык (біялогія, 11 клас, гімназія № 6 г. Гродна) і Алега Шахно (хімія, 11 клас, Ліцэй БДУ).

Уладальнікамі дыпломаў III ступені сталі Ірына Марцішонак (матэматыка, СШ № 37 г. Віцебска), Сяргей Аўлас (біялогія, 11 клас, гімназія № 12 г.Мінска), Яраслаў Задворны (матэматыка, 10 клас, СШ № 41 г. Мінска) і Глеб Гарбацэвіч (хімія, 11 клас, Ліцэй БДУ).

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Джунглі Інтэрнэта»

Камп'ютарную гульню пад такой назвай прадставіў днямі Савет Еўропы. Яе мэта — навучыць дзяцей бяспечнай навігацыі ў Інтэрнэце.

Створаная з выкарыстаннем сюжэтаў вядомых казак гульня «Джунглі Інтэрнэту» праводзіць дзяцей праз лабірынт усемагчымых перашкод да цудоўнага «электроннага горада». Яна разлічана на малых ад 7 да 10 гадоў і дапамагае ў захапляльнай форме засвоіць асноўныя правілы бяспекі. Пакуль што яна існуе толькі на англійскай мове. З часам плануецца яе пераклад яшчэ на 12 еўрапейскіх моў.

Гульня была распрацавана ў межах праграмы Савета Еўропы «Будуем Еўропу для дзяцей і разам з дзецьмі», скіраванай на падтрымку правоў дзяцей і іх абарону ад любой формы насілля, у тым ліку і з выкарыстаннем Інтэрнэту. Акрамя таго, стварэнне гульні стала важным крокам на шляху стрымання практыкі выкарыстання Інтэрнэта злачынцамі для сэксуальнай эксплуатацыі дзяцей.

Прэзентацыя гульні прайшла днямі ў Рыо-дэ-Жанейра, на Форуме па кіраванню Інтэрнэтам, праведзеным ААН. Гэта дало нагоду яшчэ раз звярнуць увагу грамадскасці на неабходнасць работы як з дзецьмі, так і з дарослымі, каб зрабіць Інтэрнэт бяспечным для карыстальнікаў усіх узростаў. Азнаёміцца з гульнёй «Джунглі Інтэрнэту» можна на адрасе: www.coe.int

Інна АРЭХАВА.

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:
«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) | Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі:

(індэкс выдання)

ПВ | месяца | літар

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. | пераадрасоўкі _____ руб. | Колькасць камплектаў

на 2008 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды (прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на I квартал або I-е паўгоддзе 2008 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе ў рэдакцыю на адрас: **220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прыза падпіску на II квартал 2008 г., гадзіннікі, футболкі, бейсболкі, печ ЗВЧ, тэлевізар «Віцязь» і суперпрыз — халадзільнік «Атлант». Карткі, наклееныя на паперу ці плёнку, або дасланыя **пасля 3 студзеня 2008 года** па паштоваму штэмпелю атрымання да ўдзелу ў гульні не прымаюцца. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 студзеня 2008 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 19 студзеня**.

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 сакавіка 2008 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на I квартал або I-е паўгоддзе 2008 года і пашпарта. Дастаўку печы ЗВЧ, тэлевізара і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 сакавіка** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Удачы ў гульні!

4 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на I квартал або I-е паўгоддзе 2008 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____ (аддзяленне сувязі)

_____ **на I кв. або I-е паўг. 2008 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ (індэкс) _____

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

ЛЕПШЫ ПАДВОРАК — НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

Завяршыўся рэспубліканскі конкурс «Лепшы вясковы падворак» сярод маладых сем'яў.

Мэта конкурсу — не толькі прыцягненне моладзі да рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы адраджэння і развіцця вёскі, але і выхаванне культуры арганізацыі гаспадаркі, адпачынку, здаровага ладу жыцця. Сёлета за права атрымаць ганаровае званне змагаліся 368 сем'яў з усёй краіны ва ўзросце да 31 года, якія маюць асабістую гаспадарку. Па выніках раённых і абласных конкурсаў у фінал выйшлі шэсць сем'яў. Урачыстае мерапрыемства адбылося ў Рэспубліканскім доме моладзі ў Мінску, дзе канкурсанты прадставілі відэафільмы пра свае гаспадаркі. Кожнаму было чым здзівіць.

Самая лепшая гаспадарка ў краіне — у маладой сям'і Шарабайкаў з Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці. Менавіта яны занялі першае месца ў конкурсе. Дзмітрый, Таццяна і маленькі Даніла заклалі вадаём, пасадзілі больш за трыста дэкаратыўных і пладовых саджанцаў. У гаспадарцы ў маладой сям'і і свінні, і куры, і бычок, а ўраджай ніколі не бывае дрэнным. Дзмітрый сур'ёзна займаецца пчалярствам — пасека налічвае семнаццаць вулляў. Захапленне Таццяны — вышыўка, беларуская народная песня. Гонар сям'і — ружы, якімі захапляецца гаспадар. Сілаў хапае не толькі на дом, але і на грамадскую працу. Дзмітрый — дэпутат сельскага Савета, Таццяна — сакратар БРСМ гаспадаркі «Канстанцінаў двор». У студзені маладая сям'я чакае другое дзіця.

Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.

«КОД» МАЦЯРЫНСКАГА СЭРЦА

З даўніх часоў прынята лічыць, што маці і дзіця — адно непарыўнае цэлае. Калі Бог даў жанчыне магчымасць мець дзіця, адначасова з гэтым ён надзяліў яе шматлікімі абавязкамі — аберагаць сваё дзіця ад ўсяго злога і заганнага, вучыць добраму і справядліваму, клапаціцца пра яго здароўе і дабрабыт, імкнуцца даць яму ўсё найлепшае… А самае галоўнае — любіць. Любіць па-мацярынску адкрыта, шчыра, самаадданa, з усёй шчодрасцю. Так павінна быць, так спрадвеку было закладзена самой прыродай але чаму тады сёння насамрэч многае аказваецца не так, як трэба, не так, як павінна быць, не так, як мы хочам?

… Алену К. і яе малодшага брата Сашу (імёны зменены па зразумелых прычынах) забралі ў дзіцячы дом дзевяць гадоў таму, калі іх маці пазбавілі мацярынскіх правоў. А віною таму было непрабуднае п'янства. Маці жыла сама для сябе, і галоўным сэнсам у жыцці былі зусім не дзеці, а «запаветная бутэлечка». Жыла, не звяртаючы ўвагі на тое, што дзецям няма ў што апранацца і часта даводзіцца галадаць, плакаць, а часам і начаваць у суседзяў. Апомнілася толькі тады, калі пазбавілі бацькоўскіх правоў. Спалохалася… Стала вельмі страшна, і тады яна …запіла зноў. Напэўна страх агарнуў яе так моцна, што адбіў у маці ўсю ахвоту змагацца за сябе, за сваё здароўе і, самае галоўнае, за будучыню сваіх дзяцей, якія і па сёння знаходзяцца ў інтэрнаце.

Але няўжо маці не разумее, што для дзяцей яна — найвялікшая каштоўнасць? Няўжо не здагадваецца аб тым, што яны толькі і мараць, каб жыць разам са сваёй мамай, а не асобна, бо якая б яна ні была, усё роўна назаўжды застанецца для іх самым родным і блізкім чалавекам? Няўжо не адчувае таго, што дзеткі цягнуцца да яе, нібыта жытнёвы колас цягнецца да сонца? Вядома, здагадваецца, усё разумее. Проста аказваецца слабейшай за жыццёвыя абставіны і знаходзіць сабе аддушыну найчасцей у спіртным.

…Неяк цёплым жнівеньскім ранкам давялося ехаць электрацягніком Брэст—Мінск у сталіцу. Дарога доўгая — ехаць амаль што пяць гадзін.

Я прайшла ў самы канец вагона і села на пустую лаўку. На адным з прыпынкаў увайшла жанчына з трыма дзецьмі.Селі акурат насупраць мяне. Хлопчыкі спачатку гарэзліва смяяліся, нешта весела расказвалі, а ўрэшце прыціхлі і, абляпіўшы маці з усіх бакоў, хутка пазасыналі.

— Вось, у Мінск едзем, — ціхенька, каб не разбудзіць сваіх дзетак, звярнулася да мяне шматдзетная маці, — на базар, да школы трэба сваіх гарэз падрыхтаваць як належыць. Ды й так, чаго-небудзь прыкупіць смачненькага.

— А не баіцеся распесціць? — пытаюся ў незнаёмкі.

— Якая ж гэта песта? — адказала субяседніца, назваўшая сябе Ірынай Мікалаеўнай. — Мае дзеткі і так колькі часу не бачылі нічога добрага… І ва ўсім я вінаватая…

На твары маёй суразмоўніцы паказаліся слёзы. Стала неяк зусім няёмка. Не ведаючы, куды падзець вочы, я ўзялася за кніжку.

— Хочаш, раскажу табе сваю гісторыю? — спытала новая знаёмая. Адклаўшы ўбок сваю кнігу, я пачала ўважліва слухаць гэты сумна-павучальны аповед на шчасце і са шчаслівым зыходам.

Цяпер ужо Ірына Мікалаеўна і не памятае, у які менавіта момант яна пачала «каціцца ўніз». Піла бесперабудна, прапівала амаль што ўсе грошы, а калі выгналі з работы, пачала прапіваць хатнія рэчы, дапамагала аднавяскоўцам па гаспадарцы за ўсё тую ж бутэльку. Піла і не бачыла, што родныя дзеці не жывуць, а існуюць, не бачаць нічога, апрача п'яных маці і бацькі (ён піў таксама), не чуюць нічога добрага, акрамя ганьбы і сварак. Не задумвалася і над тым, што ядуць дзеці, ці не баліць ім што. А яны плакалі ў падушку, не ведаючы яшчэ, што наперадзе іх чакаюць яшчэ больш складаныя выпрабаванні… У хуткім часе маці пакінула сям'ю і перайшла жыць да другога, а дзеці засталіся з бацькам. Ён уладкаваўся на працу. Але праз некалькі тыдняў зноў запіў. Жыць было невыносна: у хаце бруд і холад, хацелася есці, бацька сварыўся, выганяў дзяцей з хаты… Праз некаторы час і маці, і бацька былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў, а дзяцей забралі ў інтэрнат. На гэтым усё магло б скончыцца, каб не сіла волі гэтай жанчыны і, самае галоўнае, неўтаймаванае жаданне вырвацца з той страшнай дрыгвы, што зацягвала яе з кожным днём усё мацней і мацней.

— Не магу, вядома, сказаць, што сама вырашыла закадзіраваць, — скрозь слёзы распавядала Ірына Мікалаеўна, — бо на той момант не лічыла сябе алкаголікам. Дапамагалі мне і загадчыца нашага дзіцячага садка, і дырэктар школы, і ўчастковы, і ўрачы нашага ФАПа. Яны рэгулярна праводзілі выхаваўчыя гутаркі, казалі, што дапамогуць лячыцца, патрэбна толькі мая згода. Вялікую ролю адыграў таксама ўказ Прэзідэнта «Аб кампенсацыі расходаў на ўтрыманне дзяцей». Старшыня калгаса ўладкаваў мяне на працу і выдаў грошы на лячэнне пад адпрацоўку. Так пачалося маё новае жыццё.

Адразу як закадзіравалася, у жанчыны ўзнікла жаданне вярнуць сваіх дзяцей. Спачатку людзі з камісіі па справах непаўналетніх арганізавалі сустрэчу Ірыны Мікалаеўны з сынамі.

— Не магу без слёз успамінаць тую сустрэчу. Па праўдзе кажучы, я вельмі баялася, што сыны не пазнаюць мяне, не захочуць са мной размаўляць. Калі я прыйшла да дзяцей, яны адразу выбеглі мне насустрач і… спыніліся. А потым кінуліся да мяне: «Мама! Мамачка!» Ды давай цалаваць, абдымаць… Тады ўжо я дакладна вырашыла, што абавязкова вярну дзяцей.

Шмат намаганняў прыйшлося прыкласці жанчыне, мора горкіх слёз праліць, пакуль дачакалася нарэшце таго цудоўнага дня, калі ёй законна вярнулі дзяцей. Зараз Ірына Мікалаеўна са сваім новым мужам і любымі дзеткамі пераехала жыць у іншую вёску, уладкавалася на працу ў гаспадарку.

Цяжка, безумоўна, даводзіцца напачатку, пакуль як мае быць станеш на ногі, але ў сэрцы гэтай жанчыны, акрамя пачуцця віны перад дзецьмі, ёсць самае галоўнае — жаданне не сысці зноў на крывую дарожку. Бо аднойчы яна ўжо ступіла на яе, але лёс падараваў ёй шанц выправіцца.

— Усе беды пачынаюцца са спіртнога, — лічыць В.М. Шэйка, намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Свіслацкага раёна, Гродзенскай вобласці. — Алкагалізм — гэта страшная хвароба, такіх людзей неабходна лячыць, асабліва калі гэтыя людзі маюць дзяцей, бо менавіта дзеці ў першую чаргу пакутуюць ад гэтай згубнай цягі бацькоў да спіртнога. Для выратавання такіх людзей трэба спрабаваць усё: праводзіць выхаваўчыя размовы, прасіць кіраўнікоў гаспадарак, каб яны пад адпрацоўку выдавалі грошы на лячэнне, абавязковы ўдзел з боку суседзяў, родных, грамадства.

— Трэба спачатку імкнуцца закадзіраваць такіх бацькоў, — кажа Валянціна Мікалаеўна, — каб пазбаўленне бацькоўскіх правоў адбывалася толькі ў крайніх выпадках, каб дзеці мелі права на шчасце.

Марына ФУНТ, студэнтка журфака БДУ.

Аўтастоп

ВІЛЬНЯ НАЗАЎСЁДЫ!

Вільня — горад, які стаў родным адразу для трох нацый: літоўцаў, палякаў і беларусаў. Здаецца, ніколі не спыняцца спрэчкі наконт таго, хто ж з'яўляецца сапраўдным яго гаспадаром. Але ж сталіца балтыйскай краіны належыць літоўцам, якія здолелі зберагчы і пакінуць яе нашчадкам у сваім былым харастве.

Трошкі гісторыі

Не кожнаму гораду пашчасціла так, як Вільні. Закладзены ў 1323 годзе, ён адразу пераўтварыўся ў сталіцу магутнай дзяржавы, што паспрыяла яго хуткаму развіццю. Дарэчы, горад стаў называцца Вільнюсам толькі пасля таго, як гаспадарамі сталі тут літоўцы. Не пашчасціла і князю-заснавальніку, які з Гедыміна пераўтварыўся ў Гедымінаса. Па тых жа прыёмах «літоўскай» мовы не цяжка здагадацца, што сталіца Беларусі зусім не Мінск.

На працягу пяці стагоддзяў Вільнюс быў культурным, эканамічным і адміністрацыйным цэнтрам рэгіёна. Прэтэндаваў на званне «Трэцяга Рыма». Але былая магутнасць адышла ў нябыт разам з далучэннем беларуска-літоўскіх зямель да Расійскай імперыі. І толькі ў XX стагоддзі горад атрымаў права на новае жыццё.

Вільнюс турыстычны

Літоўцы змаглі захаваць вялікую культурную і архітэктурную спадчыну. У іх хапіла розуму не пракладваць прамыя дарогі ўздоўж горада, а захаваць усё ў першапачатковым выглядзе. Як вынік, сёння старажытны цэнтр Вільнюса самы вялікі па плошчы ў Еўропе, які знаходзіцца пад аховай ЮНЕСКА.

Кожны дзень натоўп турыстаў абрушваецца на горад. Старое месца даўно стала сапраўднай машынай па вытворчасці грошай. Шматлікія кафэ, рэстараны, музеі, экскурсіі, казіно, крамы, атэлі цалкам забяспечваюць Вільнюс. Што датычыцца цэнаў, то горад — рай для турыстаў з любой еўрапейскай краіны. Цэны тут нават ніжэйшыя, чым у нашай краіне.

Рэлігійны цэнтр

Вільнюс заўсёды лічыўся святым месцам. Цяжка ўявіць, але ў горадзе 43 каталіцкія і 18 праваслаўных храмаў! Знаходзіцца тут і знакамітая святыня ўсіх хрысціянаў Вострая Брама — жывatворны абраз Маці Божай. Размешчаны ён над уваходам у стары горад. Любы мужчына, які знаходзіўся ў Вільні, павінен быў хадзіць тут з непакрытай галавой. Таго ж, хто не прытрымліваўся правіла, чакала пакаранне. Па некаторых чутках, жыхары горада і цяпер прытрымліваюцца такой традыцыі. Але адшукаць сярод натоўпу турыстаў карэннага гараджаніна не так проста. Тысячы паломнікаў кожны год наведваюць Вільнюс і Вострую Браму.

Па храмах горада можна вывучаць гісторыю літоўскай сталіцы. Пачынаючы ад XIV стагоддзя і да сённяшняга дня тут вядзецца пабудова хрысціянскіх святынь. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца касцёл Святой Ганны, каталіцкі і праваслаўны катэдральныя саборы. Але не раю абмяжоўвацца толькі гэтымі славутасцямі.

Адным з сімвалаў горада лічыцца «Гара трох крыжоў» — гэта самае высокае месца ў Вільнюсе. Падымацца прыйдзецца сваімі нагамі: ніякіх фанікулёраў ніхто не выкарыстоўвае. Адразу папярэджу, шлях нялёгкі, а ноччу (прапаную адправіцца туды менавіта ноччу) дарога да крыжоў не падсвечваецца. Усе затрачаныя сілы на пад'ём недарэмна: прыгажосць неапісальная!

Сучасны Вільнюс

Не так даўно ў сталіцы Літвы пачалося будаўніцтва бізнэс-горада. За некалькі гадоў паўсталі нязвыклыя для Вільнюса шматпавярховікі і хмарачосы. Назвалі ўсё гэта адным актуальным для балтыйскіх краін словам «Еўропа». Дарэчы, назва цалкам адпавядае новаму раёну. Зроблена тут усё «па-еўрапейску». Асабліва прыемна, што бізнэс-горад цалкам упісваецца ў план Вільнюса. Размешчаны на процілеглым баку ракі ад старога месца, ён ніякім чынам не парушае архітэктурную кампазіцыю. Наадварот, гэта падкрэслівае ўнікальнасць горада. Такім чынам, адбываецца своеасаблівы пераход ад гісторыі да сучаснасці.

«Еўропа» вельмі папулярнае месца як сярод мясцовага насельніцтва, так і сярод прыезджых. Вялікім было маё здзіўленне, калі на паркінгу каля супермаркета заўважыў большасць машын з беларускай рэгістрацыяй. Справа ў тым, што цэны на некаторыя тавары і паслугі ў Вільнюсе танней за нашыя. Вось народ і ездзіць сюды за пакупкамі. Да таго ж, пасля ўступлення ў ЕС у Літве ўсё павінна адпавядаць стандартам якасці. Таму з магазінаў зніклі тавары «знакамітых» у Беларусі фірмаў «Adidas», «Ugo Bos», «Reebeca» і іншыя. А кошт на папулярныя еўрапейскія маркі такі ж, як у нас на айчынныя…

Свая рэспубліка — свае законы!

Ці ведалі вы, што ў Вільнюсе ёсць свая незалежная рэспубліка?! Падману тут ніякага няма. Называецца яна Ужупія. Гэта штосьці накшталт маладзёжнага раёна, дзе жыхары самі вырашаюць, як ім жыць. Існуе нават свой парламент і свая канстытуцыя. Вось некаторыя з вытрымак тутэйшых законаў: кожны мае права сяліцца каля ракі, ніхто не мае права сумаваць, ніхто не мае права прыніжаць адзін аднаго і г.д.

Ужупія ўяўляе з сабой скрыжаванне дзвюх галоўных вуліц, па баках якіх размешчаны адрамантаваныя жылыя дамы. Але калі зайсці ва ўнутраныя двары квартала, зразумееш, што з савецкага часу тут мала што памянялася. Справа ў тым, што ў Літве ўрад не будзе клапаціцца аб асабістай уласнасці. Калі ты маеш дом ці нейкае яшчэ памяшканне, будзь добры рамантаваць яго сам. У Вільнюсе шмат пабудоў, якія патрабуюць рамонту, але ўсё гэта кладзецца на плечы ўласнікаў.

Некалькі слоў пра насельніцтва

Вільнюс — шматэтнічны горад. Многія культуры, якія панавалі тут у розныя часы, пакінулі адбітак на сучасных літоўцах. Калісьці беларусы адыгралі ледзь не галоўную ролю ў станаўленні горада. Зараз яшчэ можна пачуць дзе-нідзе роднае слова. Габрэі, напрыклад, зрабілі Вільню эканамічным цэнтрам Усходняй Еўропы. На рускай мове зараз у Літве размаўляюць толькі пенсіянеры, а вось што датычыцца там, як вядома, у асноўным фізічная для таннай рабочай сілы. Вось і атрымліваецца, што ўсе хлопцы скарысталіся магчымасцю зарабіць грошы і з'ехалі з роднай краіны. Там яны атрымліваюць такія грошы за месяц працы, якія ў Літве зараблялі б за год. Тыя ж, каму не пашчасціла набыць квіток да Брытаніі ў адзін бок — звычайна проста співаюцца. У выніку, па-лова маладога насельніцтва краіны жыве зараз за мяжой.

Віно тут не п'юць!

Звычайную карціну — студэнт з бутэлькай піва, у Літве не ўбачыш. Як і ва ўсіх краінах ЕС, тут забаронена піць спіртныя напоі на вуліцах. Але скажу шчыра, ніхто вас не кране, калі вы вырашыце кульнуць адну-другую бутэльку літоўскага піва на праспекце Гедымінаса. Проста паліцэйскіх тут амаль што не бачна, а акрамя іх, вас ніхто не пакарае.

Начлег

У Вільнюсе шмат атэляў, дзе можна пераначаваць. Але гэта вам можа абысціся ў круглую суму. Лепш знайсці што-небудзь па-за межамі старога горада. Можна спытаць у мясцовага насельніцтва, хто прапануе начлег для турыстаў. Паверце, доўга шукаць не прыйдзецца. За 10 еўра вам будзе ложак, а калі пашчасціць, то і тэлевізар на два каналы. Не спрабуйце спаць на вуліцы ці на вакзале. Прычын шмат. Па-першае, ночы халодныя, ёсць рызыка застудзіць што-небудзь каштоўнае. Па-другое, шмат людзей, якія могуць спакусіцца на вашыя грошы і рэчы. Па-трэцяе, гэта не вельмі камфортна. Па-чацвёртае, можна нарвацца на супрацоўнікаў паліцыі. Яшчэ маленькая парада: не спіце на лаўцы ў ботах — гэта тут забаронена!

На заканчэнне

Сваю апошнюю ноч у Вільнюсе мне давялося правесці на вакзале. Справа ў тым, што перад ад'ездам я вырашыў прайсціся па вуліцах горада і развітацца са сталіцай Літвы. Вялізны заплечнік прыйшлося здаць у камеру захоўвання. Пасля вячэрняй прагулкі я вярнуўся на вакзал, каб забраць рэчы і выпраўляцца да літоўска-беларускай мяжы. Але нагадаю, што камеры захоўвання адчыняюцца толькі ў 7:30! У кішэні застаўся на памяць усяго толькі адзін літ. Вось і прыйшлося размяшчацца на лаўках тутэйшага вакзала, за што меў некаторыя праблемы з паліцыянтамі…

Уладзіслаў КУЗЬМІН.

Разам з птушкамі

Пад знакам вялікай белай чаплі

Сёлета рашэннем рэспубліканскага Савета грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» птушкай 2008 года была аб'яўлена вялікая белая чапля. Паводле слоў спецыяліста па экалагічнай адукацыі АПБ Руслана Шайкіна, такі выбар быў зроблены не выпадкова.

Справа ў тым, што мэтай кампаніі «Вялікая белая чапля — птушка 2008 года» з'яўляецца прыцягненне ўвагі да праблем рыбаедных птушак — жыхароў рыбгасаў. Зараз асобныя віды гэтых птушак у нашай краіне аб'яўлены «непажаданымі». Сёння на іх можна паляваць у любы час. За адстрэл вялікіх бакланаў і шэрых чапляў рыбгасы нават прысуджаюць грашовыя прэміі. У пагоні за заробкам, пад стрэлы трапляюць часам рэдкія віды птушак, у тым ліку і вялікая белая чапля. Сёлета адстрэлы «дрэнных» птушак ажыццяўляліся таксама і каля каланіяльных паселішчаў чапляў, а ў выніку неспакою там пачалі знікаць на гняздоўі і рэдкія віды крылатых. Пасля масавага адстрэлу дарослых птушак і птушанят бакланаў і шэрых чапляў на тэрыторыі «Вусце Лані», у гэтых месцінах ужо не сустракаецца вялікая белая чапля і вельмі рэдкая для Беларусі чапля-кваква.

Вялікая белая чапля трапіла ў Чырвоную кнігу Беларусі ў 1981 годзе. Галоўнымі фактарамі пагрозы для яе з'яўляецца памяншэнне плошчы і дэградацыя прыродных забалочаных поймаў. Не церпіць чапля і хваляванняў на месцы гнездавання. Да сярэдзіны XX стагоддзя адбывалася істотнае зніжэнне колькасці віду на тэрыторыі ўсёй Еўропы. У Беларусі сустракаліся адзінкавыя птушкі. Сёння вялікую белую чаплю ў нас можна ўбачыць значна часцей і практычна на тэрыторыі ўсёй краіны, аднак гнездаванні вядомы толькі на поўдні Беларусі.

Вялікая белая прыгажуня прылятае з зімоўкі з Паўночнай Афрыкі і Цэнтральнай Азіі ў апошнюю дэкаду сакавіка і ў пачатку красавіка. Гняздуецца вялікая белая чапля асобнымі калоніямі, а таксама разам з калоніямі шэрых чапляў і вялікіх бакланаў. Можа гнездавацца асобнымі парамі. Гнёзды робіць на заломах трыснягу і ў кустах. У гняздзе звычайна бывае 4—5 яек. Харчуецца вялікая белая птушка рыбай і воднымі насякомымі.

У гнездавы перыяд на спіне ў вялікай белай чаплі ўтвараюцца доўгія вельмі прыгожыя пёры, якія маюць назву эгрэткі. Менавіта таму чапля мае лацінскую назву віду — Egretta alba.

Нацыянальная кампанія «Птушка года» праводзіцца ў нашай краіне ўжо дзевяты год.

Сяргей КУРКАЧ.

Стыльны куток

ПРАДМЕТ ПРЭСТЫЖУ

У сучасным свеце гадзіннікі сталі не толькі проста механізмам, па якім мы вызначаем, колькі часу застаецца да той ці іншай падзеі, дзелавой сустрэчы, рамантычнага спаткання. Яны ператварыліся ў стыльны аксесуар, які вызначае густ і прэстыж уладальніка. Цікава таксама і тое, што, гледзячы на гадзіннік субяседніка, можна атрымаць інфармацыю пра… асаблівасці яго характару.

Напрыклад, чалавек любіць насіць гадзіннікі **квадратнай формы**. Як правіла, ён — арганізаваны, пунктуальны, патрабуе дакладнасці і ад іншых, практычны, рацыянальны, асцярожны, настойлівы. Ён заўсёды (у рабоце і жыцці) кіруецца планам, інструкцыяй, ад якіх не адступіць і паўкроку. Уладальнік такога гадзінніка не любіць незапланаваных, рэзкіх перамен у жыцці. Чалавек, які прывык спачатку ўзважваць, а пасля — дзейнічаць. Ён мае сваё меркаванне, і вельмі неахвотна яго мяняе нават пад уздзеяннем абставінаў, а калі і мяняе — то фармальна, усё роўна застаючыся пры сваім. Адным словам, ён сам — квадрат, як ні круці.

Уладальнік **гадзінніка круглай ці акругленай формы** — чалавек камунікабельны, спакойны, ураўнаважаны, прыязны, прыемны ў зносінах, добра разумее іншых, натуральны ў сваіх пачуццях, даверлівы.

Калі чалавек носіць **гадзіннік трохвугольнай формы**, то ён арыентаваны на лідарства. Яго імкненні быць першым, устаноўка на дасягненне поспеху і перамогі, імкненне да ўлады могуць праяўляцца ва ўсіх сферах жыцця. Ён імкнецца выдзеліцца. Гэты чалавек строга захоўвае субардынацыю і патрабуе яе захавання ад іншых, ён хутка схоплівае сутнасць праблемы, дзейнічае ўпэўнена, рашуча і смела.

Але калі на руцэ ў чалавека **гадзіннік прамавугольнай формы**, то вы маеце справу з кансерватарам да глыбіні душы. Гэтыя людзі цярпялівыя, фундаментальныя, умеюць чакаць, цяжка расстаюцца са сваімі звычкамі і стэрэатыпамі.

Тыя, хто аддае перавагу **гадзіннікам незвычайнай, нестандартнай формы**, схільныя да перамены пачуццяў. Гэтыя людзі — наватары, яны лёгка захапляюцца ўсім новым, але вельмі часта мяняюць прадмет свайго захаплення. Яны непрактычныя, жывуць эмоцыямі больш, чым розумам.

Дарэчы, вы ніколі не задумваліся, **адкуль з'явіліся гадзіннікі, хто іх прыдумаў**?

Самы першы механічны гадзіннік быў пабудаваны ў Мілане ў 1335 годзе. А ўжо праз некалькі гадзін у Італіі з'явіўся гадзіннік, які паказваў не толькі час, але і рух Сонца, Месяца і пяці вядомых на той час планет. З таго часу і пачаўся гадзіннікавы бум, які суправаджаўся пастаянным удасканаленнем механізмаў, змяненнем знешняга выгляду, дабаўленнем розных функцый. Да гэтага часу самым складаным механізмам з'яўляецца гадзіннік у французскім горадзе Безансон, што складаецца з 18 тысяч дэталяў і 75 цыферблатаў, якія дзейнічаюць адначасова.

Першы наручны гадзіннік быў створаны яшчэ напачатку XIX стагоддзя для пасынка Напалеона Яўгена Багарнэ, але спатрэбіўся яшчэ не адзін дзесятак гадоў, каб гэтая ідэя была ацэнена. Толькі ў XX стагоддзі наручныя гадзіннікі атрымалі прызнанне — яны аказаліся вельмі зручнымі для авіятараў. А сёння модна мець адразу некалькі пар гадзіннікаў — адны для паўсядзённага нашэння, іншыя — для заняткаў спортам ці актыўным адпачынкам. Дзяленне гадзіннікаў па мэтах выкарыстання невыпадковае.

Спартыўныя гадзіннікі разлічаныя на павышаныя нагрузкі, звязаныя з актыўным перамяшчэннем. Такія гадзіннікі робяць у больш трывалым, тоўстым корпусе, з абаронай завадной галоўкі. У якасці бранзалетаў ці раменьчыка выкарыстоўваецца сталь, тытан, сінтэтычныя матэрыялы, натуральная скура са спецыяльнай прапіткай для абароны ад поту.

Класічныя гадзіннікі, ці, як модна іх зараз называць, Casual (паўсядзённы гадзіннік), не разлічаныя на вялікія нагрузкі, на знешняе ўздзеянне. Корпус іх тонкі, а скураныя раменьчыкі не рэкамендуецца выкарыстоўваць у марской вадзе. Яны маюць

якасці, якія дазваляюць зрабіць іх больш стыльнымі і элегантнымі, не перагружаючы неўласцівымі для іх якасцямі.

Што датычыцца выбару **жаночых гадзіннікаў**, то тут няма ніякіх правілаў, і галоўным фактарам з'яўляецца выключна стыль — светаадчуванне, настрой, якія выражаны ў знешнасці. *«Мода памірае, стыль застаецца»,* — гаварыла Како Шанель. Таму выбар застаецца цалкам за жанчынай і яе адчуваннямі.

Пад асобную катэгорыю трапляюць **гадзіннікі для дайвінга**, для якіх прад'яўляюцца патрабаванні яшчэ вышэйшыя, чым для спартыўных. Асноўны фактар тут — максімальная глыбіня пагружэння ў ваду.

Але якія б ні былі вашы мэты, выбіраючы гадзіннік, звярніце ўвагу на наступныя дэталі:

Механізм. Бясспрэчнымі лідарамі на рынку гадзіннікавых механізмаў з'яўляюцца швейцарскія і японскія фірмы, чыя прадукцыя вызначаецца высокай якасцю, надзейнасцю і разнастайнасцю. Калі ж у гадзіннікаў выкарыстоўваюцца механізмы іншых вытворцаў, то верагодна (але неабавязкова), што іх якасць прымушае жадаць лепшага.

Матэрыял, з якога выраблены корпус. Самым лепшым лічыцца нержавеючая сталь і латунь. Для вырабу недарагіх і недаўгавечных гадзіннікаў выкарыстоўваюцца алюмініевыя сплавы. Добра зарэкамендавалі сябе тытанавыя сплавы, але з-за цяжкасці апрацоўкі тытану, гадзіннікі з гэтага матэрыялу не прадстаўлены ў шырокім асартыменце. Набываючы гадзіннік у тытанавым корпусе, звярніце ўвагу на фірму-вытворцу і на вагу гадзінніка. Чым ён лягчэйшы, тым больш у саставе тытану.

Бранзалет. Як правіла, скураны раменьчык добра ўбірае ў сябе вільгаць і валодае высокай эластычнасцю. У той жа час тэрмін іх выкарыстання не вельмі высокі. Металічныя бранзалеты бываюць з цэльнаметалічных звёнаў (больш дарагія) і з пракату металу.

Пакрыццё гадзінніка. Самым дрэнным варыянтам з'яўляецца лакавае пакрыццё, якое ахвотна выкарыстоўваюць кітайскія вытворцы. Самае лепшае пакрыццё — яго… адсутнасць пры ўмове, што гадзіннік выкананы з нержавеючай сталі, тытанавага сплаву ці латуні.

Шкло бывае трох відаў: пластмаса — гэта самы танны матэрыял, вызначаецца слабай устойлівасцю да драпін, але, як правіла, не расколваецца; крышталь (загартаванае шкло) устойлівае да з'яўлення драпін, але больш хрупкае; штучны сапфір — самы дарагі і самы ўстойлівы матэрыял.

Цана. Кошт добрага гадзінніка можа вагацца ад сотні тысяч да некалькіх мільёнаў рублёў. На ўтварэнне цаны ўплывае вядомасць кампаніі, наяўнасць функцый, матэрыял, з якога зроблены гадзіннік.

Але незалежна ад той сумы, якую вы збіраецеся патраціць на гадзіннік, вы ў любым выпадку становіцеся ўладальнікам прэстыжу, прадукта высокай якасці, які стане вашай візітоўкай на доўгія часы.

А тым, хто гадзіннік не носіць, можна сказаць, што гэта шчаслівыя людзі, якраз тыя, хто, паводле вядомага выразу, часу не назірае.

Настасся ФАНДО.

ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА I КВАРТАЛ I I ПАЎГОДДЗЕ 2008 ГОДА
З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ
Наша культурная асабрацца
ЧАРНОБЫЛЮ
МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ
СВАЯ СПРАВА
ЖЫВАНДОЛЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
КУПІ ЛЕПШАЕ!
ТАВАРЫ ПАСЛУГІ ЦЭНЫ
Краіна здароўя

ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	8800 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 52800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	8300 рублёў на месяц 24900 рублёў на квартал 49800 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	14000 рублёў на месяц 42000 рублёў на квартал 84000 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	12800 рублёў на месяц 38400 рублёў на квартал 76800 рублёў на паўгоддзе
ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)		
ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63850	7460 рублёў на месяц 26400 рублёў на квартал 44760 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ	63145	6990 рублёў на месяц 20970 рублёў на квартал 41940 рублёў на паўгоддзе
ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ	63858	9938 рублёў на месяц 29814 рублёў на квартал 59628 рублёў на паўгоддзе
ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ	63239	9431 рубель на месяц 28293 рублі на квартал 56586 рублёў на паўгоддзе

Muz-news

ВЕЧАРЫНКА Ў ХАЛАЦЕ І ТАПКАХ

Менавіта такім чынам сустрэла свой дзень нараджэння спартсменка, спявачка і тэлевядучая Вольга Барабаншчыкава. Не тое каб дзяўчына засталася на свята адна — наадварот, павіншаваць яе прыйшлі каля 40 чалавек: бацькі, сястра Каця Бягун, любімыя пляменніцы, сябры, сярод якіх фітнэс-трэнер Святлана Кашыцкая, тэнісістка Наталля Зверава, лідар гурта «Харлі» і аўтар большасці песень Вольгі Яўген Чалышаў, спявачкі Улялюм і Corriana. Прычым яны меркавалі, што збіраюцца ў звычайны рэстаран, а там — сюрпрыз…

Рэстаран «загрыміравалі» пад кватэру Барабаншчыкавай, развесілі паўсюль фота з яе асабістага альбома, а на ўваходзе гасцей сустракала сама Вольга: у хустцы, халаце і дамашніх тапках. Яна то варыла суп, то гушкала дзіця, то гартала на ложку часопісы, стварaючы атмасферу мітусні хатняй гаспадыні, якая чакае гасцей. Самі госці з такога вобразу доўга смяяліся. «Гэта быў вельмі пазітыўны вечар у кампаніі блізкіх і дарагіх мне людзей, — прыгадвае Вольга. — Было многа кветак і падарункаў. Самым кранаючым стаў вялізны калаж з фатаграфій розных гадоў майго жыцця».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 26 ЛІСТАПАДА

5.20 Дак. серыял «Марскія млекакормячыя».
6.20, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 0.40 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.25 «Дзелавое жыццё».
8.20 Гатуем разам!
8.30 У свеце матораў.
9.05 Галерэя вобразаў.
9.30 Фігуры.
10.00, 16.45 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.55, 17.40 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.15 Меладрама «Спакуса».
14.00 Здароўе.
14.30 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 Зорны старт. Дзённік дзіцячага Еўрабачання.
16.15 Час кіно.
19.35 Час спорту.
20.00 Ток-шоў «Ход у адказ». «Усынаўленне».
21.00 Панарама.
21.45, 2.35 Серыял «Медыум».
22.45 Трылер «Пад прыцэлам».

Яна — гаспадыня буйной узброевай кампаніі, а тэрарыст — звар'яцелы бацька дзяўчынкі, забітай са зброі яе фірмы. Ёй прыходзіцца ўступіць у доўгую і небяспечную гульню.
0.45 Хакей для ўсіх.
1.25 Дак. серыял «Загадкавыя мясціны».
2.10 Серыял «Клава, давай!».

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05 «Пакуль усе дома».
7.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40, 11.10 «Дзве зоркі-2».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.20, 3.20 Навіны спорту.
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Дэтэктывы».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
16.15 Камедыя «Наш амерыканскі Бора».
18.20 «Дзеля смеху».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
22.00 Серыял «Дыверсант».
23.25 «Злачынствы стагоддзя».
0.00 Тэорыя неверагоднасці. «Палігамія або манагамія».
0.45 «Фабрыка зорак «дома».
1.15 Серыял «Адысея».
2.10 Серыял «Абаронца».
Тэхнічная прафілактыка з 3.30 да 5.00.
5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.

6.45, 14.20 Мультсерыял «Олівер Твіст».
7.05 «Ранішняя падзарадка».
8.05 Добрыя навіны.
8.35 Невытлумачальна, але факт.
9.25 У гэты дзень.
9.30, 16.30 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.25 Святло далёкай зоркі. Рыта Младэк.
10.55, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.00 Усё аб бяспецы.
12.30 Гаспадар.
13.00 «Школа рамонту».
13.55 Тэлебарометр.
14.40 Пазакласная гадзіна.
14.55 Нянька спяшаецца на дапамогу.
15.50 Ядзім дома.
18.35 Навіны культуры.
18.50 Серыял «Каменская-3».
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.25 Хакей. Формула гульні.
23.00 Меладрама «Магнітныя буры».

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20 «З чаго пачынаецца раніца».
7.45 «Прачніся і спявай».
8.25 «Вялікае сняданне».
9.00 «Тыдзень».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Культурнае жыццё».
11.05 Серыял «Рэбека».
12.00, 18.25 Серыял «Зацьменне».
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50, 23.00 «Крутыя рабяты».
14.55 Мультсерыял «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта».
15.20 Серыял «Элен і рабяты».
15.50 «Народжаныя ў СССР».
16.50 «Бабскі бунт».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.25 Маст. фільм «Гульні ў салдацікі».
22.55 «Закон і крымінал».
23.10 «Сталічны футбол».
23.40 «Гучная справа».
0.30 «Уваскрэсенне класікі».

4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «ОБЖ».
5.30 Вясельныя вар'яцтвы.
6.30 Удачная пакупка.
7.30 «Разам».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 «Казахстан: старонкі гісторыі».
9.00 Спецыяльны рэпартаж.
9.30 Хіт-экспрэс.
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00, 22.25 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Зорка Улугбека».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Дак. серыял «Лепшая сусветная дваццатка».
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 Цацкі для дарослых.
18.10 Серыял «За ўсё табе дзякую».
19.15 «Цік-так».
19.30 «Агульны інтарэс».
20.00 Рэспубліка — сёння.
21.00 Серыял «Крымінальны красворд».
22.00 Акцэнты.

7.00, 23.10 «Навіны кіно».
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25, 23.20 «Метэапрагноз».
7.30 Маст. фільм «Кароль малпаў». 1-я серыя.
9.00 «Клуб 700».
9.30 «К-відэа для дзяцей».
9.50, 19.50 Серыял «Нікіта».
11.00 Маст. фільм «Дзённік памяці».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 Мультпарад.
17.10 Серыял «Зорныя вароты».
18.30 Серыял «Нябачнае жыццё раслін».
18.55 «К-гульня».
19.00 «Мой любімы гадаванец».
19.30 «Зялёны дом».
19.45, 21.05 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10 Трылер «Інтэрв'ю з вампірам».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Зброя Расіі. Ракетныя войскі».
10.00 «Рэвізор».
10.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 17.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50 «Фитиль».
12.50 Серыял «Пецярбургскія тайны».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.15 Маст. фільм «Дзевяць дзён да вясны».
16.00 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.50 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.40 Добрай ночы, малыя!
19.50 Серыял «Секунда да...»
21.00 Серыял «Бандыцкі Пецярбург-10. Расплата».
22.00 Серыял «Закон Мерфі-3».
23.10 Весткі+.

6.00 Сёння раніцай.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.00 «Агляд».
9.30 «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.15 «Следства вялі...».
13.25 Баявік «Выпадковы шпіён».



Калі прагнеш прыгод, аднойчы яны знойдуць цябе самі. Так і здарылася, калі сціплы прадавец спартыўных тавараў улез у самую гушчу падзей і аказаўся ўцягнутым у шпіёнскую гульню сусветнага маштабу.
15.05 «Асабліва небяспечны!».
15.30, 18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
19.45 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела-2».
20.50 Серыял «Апошняе падарожжа Сіндбада».
22.30 Серыял «Марскія д'яблы».
23.35 «Крымінальная Расія».

5.00 Канал «Настрой».
7.30 Выбары-2007.
7.50, 14.20, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
7.55 Маст. фільм «Чужыя пісьмы».
10.00 «Карціна для дырэктара». Дэтэктыў Леаніда Млечына.
10.15, 13.50, 0.05 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.50 «Пастскрыптум».
11.55 «Доказы віны». «Удаў».
12.45 Лінія абароны.
14.00, 17.00 Дзелавая Масква.
14.30 «У цэнтры падзей».
15.30 Новая «Часінка».
16.45 Выбары-2007. Тэледэбаты.
17.15 Марыя Парошына ў праграме «Запрашае Барыс Ноткін».
17.50 Серыял «Расплата за грахі».
18.55 «Рэальныя гісторыі». «Каханне ў кіно».
20.05 Серыял «Зацьменне».
21.05 Серыял «Каменская».
22.10 Момант ісціны.
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.35 Збор сачыненняў. К. Хартман. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.
0.25 Серыял «Чыста англійскае забойства».
2.05 Серыял «Адна справа на дваіх».
3.05 Маст. фільм.
4.20 Мультпарад.

9.30 Мотаспорт.
9.45 Стральба з лука.
10.15 Агляд снежнага ўік-энда.
10.45 Горныя лыжы. Кубак свету ў Канадзе.
12.00, 15.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі.
14.00, 18.00 Футзала.
16.00, 20.00 Шары.
19.00, 1.00 Футбол. Еўрагалы.
19.45, 2.15 Вось гэта дзіва!!!
21.00 Самыя дужыя людзі планеты.
22.00 Байцоўскі клуб.
1.45 «Eurosport Buzz».

ФІЛЬМ ДНЯ

ЛАД 23.00 «МАГНІТНЫЯ БУРЫ» (РАСІЯ, 2003 г.)

Узнагароды: прэмія «Залаты Арол», прэмія «Ніка», прыз імя Р. Горына на КФ у Сочы, прыз міжнароднага КФ «Pacific meridian», прэмія «Залаты Авен», прэмія «Белы квадрат», прыз КФ «Кахаць па-руску» (2003 г.).

Правінцыяльны горад з вялікім металургічным камбінатам. У кабінетах завода дзеляць уласнасць, у цэхах рабочыя б'юцца з рабочымі. Адзін з актывістаў барацьбы — Валера. Калі заводскія хваляванні застануцца ззаду, Валера, які страціў усё і знайшоў каханне, паспрабуе пачаць новае жыццё.

Рэжысёр — Вадзім Абдрашытаў. **У ролях:** Максім Аверын, Вікторыя Талстаганава, Любава Арыстархава, Барыс Шувалаў, Рушана Зіяфітдзінава, Сяргей Пакроўскі.

АЎТОРАК, 27 ЛІСТАПАДА

5.30, 15.50 Серыял «Прыіск».
6.20, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 23.40 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.45 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
8.35 Час спорту.
9.05 «Адвага» ў зімовым цырку «Бугліён».
10.00, 16.45 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.55, 17.45 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.15 Маст. фільм «Шлях у «Сатурн».

Другая сусветная. Капітан Крылоў атрымлівае заданне пранікнуць у разведвальную школу Абвера «Сатурн», якая рыхтуе агентаў, што засылаюцца ў Маскву.
13.45 Зорны старт. Дзённік дзіцячага Еўрабачання.
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Клава, давай!».
19.35 Сфера інтарэсаў.
19.55 Серыял «Ліквідацыя». 1-я серыя.
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Ліён»—«Барселона».
23.55 Дзень спорту.
0.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд дня.
1.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Інтэр»—«Фенербахчэ».

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
9.05 Чакай мяне.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Дэтэктывы».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
16.15 Серыял «Дачка садоўніка».
17.15, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Дзеля смеху».
18.55 Серыял «Таццянін дзень».
20.00 Час.
22.05 Серыял «Дыверсант».
22.55 «Закон і крымінал».
23.10 «Гарачы лёд».
23.40 «Надзвычайныя гісторыі».
0.30 Серыял «Рэдакцыя».

4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «ОБЖ».
5.30 Сведчыя і экстрасэнсы.
6.30 Удачная пакупка.
7.30, 18.10 Серыял «За ўсё табе дзякую».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 Паэзія Арменіі.
9.00 Каму на Русі жыць добра.
9.30, 19.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00, 22.15 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Вей, ветрык».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Дак. фільм «Дзіўныя і неверагодныя верталёты».
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 Дак. серыял «Джэмі ў сябе дома».
19.15 «Цік-так».
21.00 Серыял «Крымінальны красворд».
22.00 Акцэнты.

7.00, 21.00 «К-гульня».
7.10, 10.55, 22.55 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Трое ў каноэ».
8.50, 19.35 «Навіны кіно».
9.00 «Дом жывых гісторый».
9.30, 17.00 Мультпарад.
9.50, 19.50 Серыял «Нікіта».
10.50 Інфармбюро «Міжнароднае».
11.00 Маст. фільм «Цырульнік».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.10 Серыял «Зорныя вароты».
18.30 Серыял «Жыццё раслін».
19.00 «Мой любімы гадаванец».
19.15 «Зялёны дом».
19.45, 21.15 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
21.20 Маст. фільм «Куб-2».

23.00 Серыял «Амазонкі».
23.45 «Начны тэлечат».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Міхаіл Ульянаў».
10.00, 19.50 Серыял «Секунда да...».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.15, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Бандыцкі Пецярбург-10. Расплата».
12.50 Серыял «Пецярбургскія тайны».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.30 «Кулагін і партнёры».
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.40 Добрай ночы, малыя!
22.00 Серыял «Абаронца».
23.10 Весткі+.

6.00 «Сёння раніцай».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.05 «Наша ўсё!».
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50, 23.35 «Крымінальная Расія».
11.20 Серыял «Усё змяшалася ў доме».
13.25 Серыял «Урачэбная тайна».
15.20 «Асарці».
15.35, 18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
19.45 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела-2».
20.50 Серыял «Апошняе падарожжа Сіндбада».
22.30 Серыял «Марскія д'яблы».
23.35 «Да бар'ера!».

5.00 Канал «Настрой».
7.30 Выбары-2007.
7.50, 14.20, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
7.55 Маст. фільм «І жыццё, і слёзы, і каханне...».
10.00 «Неасцярожны вадзіцель». Дэтэктыў Леаніда Млечына.
10.15, 13.50, 23.35 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30, 19.50 Падзеі.
10.45, 20.05 Серыял «Зацьменне».
11.45, 21.05 Серыял «Каменская».
12.50 Момант ісціны.
14.00, 17.00 Дзелавая Масква.
14.30 Серыял «Адна справа на дваіх».
15.30 Новая «Часінка».
16.45 Выбары-2007. Тэледэбаты.
17.15 Сялянская застава.
17.50 Серыял «Расплата за грахі».
18.55 Тварам да горада.
22.10 «Скандальнае жыццё» з Вольгай Б. «Вырвацца з секты».
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.55 Баскетбол. Кубак УЛЕБ. «Панелініос» (Афіны, Грэцыя)—«Дынама» (Масква).
1.05 Маст. фільм.
3.00 Маст. фільм «Асцярожна, бабуля!».
4.30 Мультфільм.

9.30 «Eurosport Buzz».
10.00, 16.00, 0.00 Шары.
11.30, 19.00, 20.15 Футбол. Еўрагалы.
12.15, 13.30, 15.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
13.15, 1.45 Вось гэта дзіва!!!
14.30 Футбол. Еўра-2008.
18.00, 19.15 Скачкі на лыжах з трамплінаў.
21.00 Бокс.
2.00 Аўтаспорт.

ФІЛЬМ ДНЯ

ТБЦ 3.00 «АСЦЯРОЖНА, БАБУЛЯ!» (СССР, 1960 г.)

У Леначкі — маладога дырэктара Дома культуры, які будуецца, усё было добра, і раптам загадчык будадзелам перанёс здачу аб'екта, а сама Леначка пасварылася з брыгадзірам мантажнікаў, якога тайна кахала. І тут на выручку ёй прыходзіць бабуля — жанчына валявая, энергічная, з гераічным ваенным мінулым.

Рэжысёр — Надзея Кашаверава. **У ролях:** Фаіна Ранеўская, Арыядна Шэнгелая, Леанід Быкаў, Ралан Быкаў, Сяргей Філіпаў, Людміла Маркелія, Святлана Харытонава.

СЕРАДА, 28 ЛІСТАПАДА

5.25, 15.50 Серыял «Прыіск».
6.10 Слова Мітрапаліта Філарэта на пачатак Каляднага посту.
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 23.40 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.45 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 19.55 Серыял «Ліквідацыя».
10.00, 16.45 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.55, 17.40 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.15 Маст. фільм «Канец «Сатурна».

Да нейтралізацыі дзейнасці магутнага нацысцкага разведоргана «Сатурн» усё гатова. Але ці ўсё пройдзе гладка?
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Клава, давай!».
19.35 Зямельнае пытанне.
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Селтык»—«Шахцёр».
23.55 Дзень спорту.
0.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд дня.
1.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Русенборг»—«Чэлсі».

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Таццянін дзень».
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35, 3.20 Навіны спорту.
11.10, 21.05 «Застацца ў жывых».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Дэтэктывы».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
16.15 Серыял «Дачка садоўніка».
17.15, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Дзеля смеху».
20.00 Час.
22.10 Серыял «Дыверсант».
23.40 «Дзеці-героі». Дак. фільм.
0.45 «Фабрыка зорак «дома».
1.20 Серыял «Адысея».
2.15 Серыял «Абаронца».
3.25 Серыял «Тайны Смалвіля».

6.45, 14.25 Мультсерыял «Олівер Твіст».
7.05 «Ранішняя падзарадка».
8.05, 15.55 Ядзім дома.
8.40, 18.50 Серыял «Каменская-3».
9.35 У гэты дзень.
9.40, 16.35 Гадзіна суда з Паўлам Астахавым.
10.30 Лабірынты: каменная абсерваторыя.
10.55, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
12.00, 22.30 Серыял «Анатомія Грэй».
12.50 «Спорт-кадр».
13.20 «Цудоўная сямёрка». Эпізод трэці.
13.50 «Тэатр. Выбранае...» Алег Корчыкаў.
14.45 Пазакласная гадзіна.
15.00 Бітва экстрасэнсаў.
18.35 Навіны культуры.
20.00 «Калыханка».
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Нянька спяшаецца на дапамогу.
23.25 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама»—«Хімік».

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.50 «З чаго пачынаецца раніца».
7.40, 15.50, 23.00 «Крутыя рабяты». Дзённік.
8.40 «Аўтапанарама».
9.00, 20.50 Серыял «Салдаты 13».
10.00 «Гарачы лёд».
10.40 «Далёкія сваякі».
11.05 Серыял «Рэбека».
12.00, 18.25 Серыял «Зацьменне».
13.00 «Рэпарцёр СТБ».
13.50 «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Расследаванні.».
14.45 «Магутныя рэйнджары. Касмічны патруль «Дэльта». Мультсерыял.
15.10 Серыял «Элен і рабяты».
16.00 «Я — падарожнік».
16.50 «Бабскі бунт».
17.30 «Званая вячэра».
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.25 «Добро пожаловать».
22.00 «Мінск і мінчане».
22.55 «Закон і крымінал».
23.10 «Рэактыўны бокс».
23.40 «Дэтэктыўныя гісторыі».
0.30 Серыял «Рэдакцыя».

4.00, 5.00, 6.00, 7.00 Зараджайся!
4.30, 14.00 Серыял «ОБЖ».
5.30 «Пра каханне».
6.30 Удачная пакупка.
7.30, 18.10 Серыял «За ўсё табе дзякую».
8.30, 11.30, 14.30, 17.30, 20.30 «Навіны Садружнасці».
8.45 «Мільён пытанняў аб прыродзе».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 19.30 Ток-шоў «Спрэчная тэрыторыя».
10.30 Серыял «Раксалана».
12.00, 22.25 Студыя 60х90.
12.15, 22.30 Маст. фільм «Давай пажэнімся».
13.45 Урокі англійскай мовы.
15.00 Планета VISION прадстаўляе...
16.00 «Гадзіна суда». Справы сямейныя.
17.00 «Следчыя і экстрасэнсы».
19.15 «Цік-так».
21.00 Серыял «Крымінальны красворд».
22.00 Акцэнты.

7.00 «Навіны кіно».
7.10, 10.55, 21.05, 22.55 «Метэапрагноз».
7.15 Маст. фільм «Місія выратавання».
9.00 «К-відэа» для дзяцей.
9.30 «Адшукваецца адпачынак».
9.50, 19.50 Серыял «Нікіта».
10.50 Музпарад.
11.00 Маст. фільм «Востраў скарбаў».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 «Жыццё, поўнае радасці».
17.00 Мультпарад.
17.10 Серыял «Зорныя вароты».
18.30 Серыял «Жыццё раслін».
18.55 «К-гульня».
19.00 «Архіў 8-га тэлеканала».
19.45, 21.10 «Распродаж. Навінкі. Акцыі».
20.45 «Вечарніца».
20.55 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.00 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.15 Драма «Цырульнік».



23.00 Серыял «Амазонкі».
23.45 «Начны тэлечат».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.05 «Радавы праклён Гандзі».
10.00, 19.50 Серыял «Секунда да...».
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.30, 14.15, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
11.50, 21.00 Серыял «Бандыцкі Пецярбург-10. Расплата».
12.50 Серыял «Пецярбургскія тайны».
13.50, 16.50, 18.50, 23.00 Весткі—Беларусь.
14.30 «Кулагін і партнёры».
15.00 Суд ідзе.
15.55 Серыял «Скрадзеныя пацалункі».
17.30 Мясцовы час. Весткі—Маскоўская вобласць.
17.50 Серыял «Анёл-ахоўнік».
19.40 Добрай ночы, малыя!
22.00 Серыял «Абаронца».
23.10 Весткі+.

6.00 Сёння раніцай.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00 Сёння.
9.10 «Наша ўсё!».
10.20 «Агляд. Выратавальнікі».
10.45, 23.35 «Крымінальная Расія».
11.15 Серыял «Усё змяшалася ў доме».
13.30 Серыял «Урачэбная тайна».
15.20 «Асарці».
15.35, 18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
19.40 Серыял «Оперы. Хронікі забойнага аддзела-2».
20.50 Серыял «Апошняе падарожжа Сіндбада».
22.30 Серыял «Марскія д'яблы».

5.00 Канал «Настрой».
7.30 Выбары-2007.
7.50, 14.20, 18.50 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
7.55 Маст. фільм «Слова для абароны».
9.50 «Дэтэктыўныя гісторыі». «Танец з забойцам».
10.15, 13.50, 23.35 Пятроўка, 38.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 Серыял «Зацьменне».
11.45, 20.05 Серыял «Каменская».
12.55 «У цэнтры ўвагі». «Яды. Сучасная гісторыя атручэнняў».
14.00 «Рэзананс».
14.30, 3.40 Серыял «Адна справа на дваіх».
15.30 Новая «Часінка».
16.45 Выбары-2007. Тэледэбаты.
17.15 «21 кабінет».
17.50 Серыял «Расплата за грахі».
18.55 «Доказы віны». «Цёмнае мінулае».
22.10 «Вуліца твайго лёсу». Тыя, хто засланіў Маскву.
23.05 Падзеі. 25-я гадзіна.
23.55 Маст. фільм.
2.10 Маст. фільм «Выкуп».

4.30 Мультфільм.

9.30 Экстрэмальны спорт.
10.00 Мотагонкі.
11.00, 14.00, 15.00, 18.00, 19.15, 20.15, 0.15 Скачкі на лыжах з трамплінаў.
12.00, 16.00, 23.15 Шары.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
20.45, 2.00 Алімпійскія гульні.
21.15, 21.25, 23.10 Выбранае па серадах.
21.20 Конны спорт.
21.30 Гольф.
22.30 Гольф-клуб.
22.35 Парусны спорт.
1.00 Футбол. Кубак УЕФА.

ФІЛЬМ ДНЯ

ТБЦ 7.55 «СЛОВА ДЛЯ АБАРОНЫ» (СССР, 1976 г.)

Адвакат і яе падабаронная — прыкладна аднаго ўзросту. Другая абвінавачваецца ў замаху на забойства з-за рэўнасці. Унікаючы ў падрабязнасці адносінаў падабаронная з чалавекам, з-за якога яна была гатова ўчыніць злачынства, адвакат спачувае ёй і стараецца дапамагчы.

Рэжысёр — Вадзім Абдрашытаў. **У ролях:** Марына Няёлава, Галіна Яцкіна, Алег Янкоўскі, Станіслаў Любшын.

ЧАЦВЕР, 29 ЛІСТАПАДА

5.35, 15.50 Серыял «Прыіск».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 18.50, 0.25 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам!
8.35 Зямельнае пытанне.
9.05, 19.55 Серыял «Ліквідацыя».
10.00, 16.45 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.50, 17.40 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.15 Маст. фільм «Бой пасля перамогі».
14.00 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30, 1.40 Серыял «Клава, давай!».
19.35 «Сфера інтарэсаў».
21.00 Панарама.
21.45, 2.05 Серыял «Медыум».
22.45 Баявік «13-ы раён».
0.35 Дзень спорту.
0.45 Дак. серыял «Загадкавыя мясціны».

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 3.00, 5.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
9.05, 18.55 Серыял «Таццянін дзень».
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.35, 3.20 Навіны спорту.
11.10, 21.05 «Застацца ў жывых».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Дэтэктывы».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
16.15 Серыял «Дачка садоўніка».
17.15, 5.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Дзеля смеху».
20.00 Час.
22.05 Серыял «Дыверсант».
23.40 «Любоў Палішчук. Апошнія 24 гадзіны». Дак. фільм.
0.45 «Фабрыка зорак «дома».
1.20 Серыял «Адысея».
2.15 Серыял «Абаронца».
Тэхнічная прафілактыка з 3.30 да 5.00.

6.45 Мультсерыял «Олівер Твіст».
7.05 «Ранішняя падзарадка».
8.05, 16.45 Ядзім дома.
8.40, 18.50 Серыял «Каменская-3».
9.35 У гэты дзень.
9.45 Урачэбныя тайны.
10.05, 17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.00 Анекдот. LAD.
11.25 Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка на 15 км. Жанчыны.
13.05, 22.25 Серыял «Анатомія Грэй».



14.10 Пазакласная гадзіна.
14.25 Біятлон. Кубак свету. Індывідуальная гонка на 20 км. Мужчыны.
16.10 Іншыя. Выпрабаванне свабодай.
18.35 Навіны культуры.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларуская часінка.
21.25 Невытлумачальна, але факт.
23.25 Проста праграма.
0.10 Хакей. НХЛ. Матч тыдня.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.50 «З чаго пачынаецца раніца».
7.40, 15.50, 23.00 «Крутыя рабяты». Дзённік.
8.40 «Добро пожаловаться».
9.00, 20.50 Серыял «Салдаты 13».
10.00 «Рэактыўны бокс».
10.40 «Праўда аб НЛА: Паляўнічыя на НЛА». Дак. фільм.
11.05 Серыял «Рэбека».
**12.

НАВУКОЎЦЫ НІІСМа ПРЫВЯДУЦЬ У НАШЫ ДАМЫ НАНАТЭХНАЛОГІІ

①

Не ўсе ведаюць, што ў разгалінаванай сетцы прадпрыемстваў будматэрыялаў Беларусі ёсць уласны «мазгавы цэнтр», які непасрэдна ўплывае і на будаўнічую галіну рэспублікі. Гэта навукова-даследчы інстытут будаўнічых матэрыялаў у Мінску, на Мініна, 23, больш вядомы як НІІСМ. Ён займаецца распрацоўкай новых тэхналогій, і на гэтай аснове — стварэннем прагрэсіўных будаўнічых матэрыялаў. А таксама пастаянным удасканаленнем дзеючых тэхналогій, каб прыдаць больш высокія спажывецкія якасці матэрыялам ужо вядомым.

Занадта многае ў нашым жыцці залежыць ад эфектыўнасці работы гэтага калектыву. Таму мы пастараліся, каб расповяд аб творчым пошуку, які ўжо 68 гадоў вядзецца ў сценах НІІСМа, атрымаўся, наколькі гэта магчыма, грунтоўным. Лічым, што нам пашанцавала, бо расказчыкамі былі людзі дасведчаныя — доктар тэхнічных навук Уладзімір Мікалаевіч Ганчарык, які да апошняга часу на працягу амаль 15 гадоў нязменна ўзначальваў інстытут; загадчык лабараторыі шкла кандыдат тэхнічных навук Валадзімір Барысавіч Шпектар — разам са сваімі калегамі Валадзімір Барысавіч выйшаў на прымяненне нанатэхналогій (!!!) у вырашэнні вытворчых задач; а таксама супрацоўнікі яго лабараторыі, іншыя навукоўцы, практыкі. Мы пазнаёміліся з грунтоўнай працай па гісторыі інстытута, укладальнікам якой быў Яўген Якаўлевіч Падлузскі, а таксама са зборнікам асноўных навукова-тэхнічных распрацовак інстытута і іншымі дакументамі, якія толькі дадаюць павагі да калектыву і вагі яго творчаму пошуку. У выніку абагульнення ўсяго, што мы даведаліся з калектыўнага расказу нашых суразмоўцаў і шматлікіх дакументаў, і з'явіліся гэтыя нататкі.

РАДКІ З БІЯГРАФІІ

Нарадзіўся перспектыўны калектыў у досыць трывожны час — у верасні 1939-га. Цытуем дакумент: «Стварэнне інстытута было абумоўлена неабходнасцю павышэння тэхнічнага ўзроўню вытворчасці будаўнічых матэрыялаў з мэтай забеспячэння патрэб народнай гаспадаркі Беларускай ССР», а яна ў 30-я гады мінулага стагоддзя развівалася даволі высокімі тэмпамі. Цікавы факт: рост аб'ёмаў вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у 1937 годзе апераджаў па тэмпах развіцця ўсю прамысловасць рэспублікі.

Перыяд сапраўднага росквіту калектыў перажыў тады, калі рэспубліцы патрэбна было адбудоўвацца. Гэта быў напружаны час пасляваеннага адраджэння. Ужо ў 1955 годзе інстытут меў сучаснае абсталяванне для правядзення даследаванняў з выкарыстаннем рэнтгенаструктурнага, спектральнага, электронна-мікраскапічнага, тэрмаграфічнага, петраграфічнага метадаў.

Другі такі ж па напружанасці і высокай прадукцыйнасці перыяд пачаўся бліжэй да сярэдзіны 90-х, калі краіна і разам з ёю навука пачалі выходзіць з пасляперабудовачнага паралічу. А да гэтага былі складаныя часы, абумоўленыя развалам вялікай краіны, тады на працягу многіх месяцаў амаль што цалкам адсутнічала фінансаванне. Работа ёсць — плаціць за яе няма каму. На гэтым фоне пачаўся адток кадраў. А кадры ў навуцы рыхтаваць цяжка, вельмі важную ролю адыгрывае не толькі «божы дар» — талент навукоўца, але і вытворчы вопыт. 170 чалавек толькі ў інстытуце, плюс калектыў выпрабавальнага цэнтра — усім патрэбна было даць аплатную работу.

Пералом наступіў падчас завяршэння будаўніцтва Беларускага цэментнага завода ў Касцюковічах. Інстытут прымаў у важным дзяржаўным праекце самы непасрэдны ўдзел — міністэрства даручыла яму ролю генпадрадчыка па ўсіх пусканаладачных работах. Адпаведна, былі выдзелены сродкі для гэтых работ, і за 94—96-я гады калектыў змог захаваць і нават крыху ўмацаваць свае пазіцыі на гаспадарчых дагаворах з субпадрадными арганізацыямі. Затым аднавіліся пазабюджэтныя фонды, канкрэтна — фонд будаўнічай навукі і інавацыйны фонд, і стала крыху лягчэй.

Відаць, навукоўцы няблага сябе зарэкамендавалі, бо ўжо пазней інстытуту была даручана рэканструкцыя наогул усёй цэментнай вытворчасці — усіх трох цэментных заводаў: у Касцюковічах, Крычаве і ў гарадскім пасёлку Краснасельскі Ваўкавыскага раёна. Патрэбна пераводзіць цэментную галіну на так званы сухі спосаб вытворчасці, прычым на сыравіне, на якой спрадвеку выконваўся толькі мокры спосаб. Тое, што некалі ўкаранялі пры навуковым кіраўніцтве інстытута на эксперыментальнай лініі і што было ўпершыню не толькі ў велізарным Савецкім Саюзе, але і ў Еўропе — яно сябе апраўдала і ўвайшло ва ўжытак прафесіяналаў як «касцюковіцкая тэхналогія». Тэхналогія вытворчасці цэменту па сухім спосабе з пераўвільготненых рыхлых парод сыравіны пацвердзіла сваю жыццяздольнасць. А вопыт эксплуатацыі эксперыментальнай лініі даў магчымасць распрацаваць тэхнічнае рашэнне для дасягнення расходу паліва на тону цэменту ў аб'ёме 130 —135 кілаграмаў, што і лягло ў аснову рэканструкцыі цэментнай прамысловасці. Напомнім, што мокры спосаб «спальвае» 200—220 кілаграмаў на тону.

Сёння такая эканомія як нельга больш актуальная. Так што ўсе астатнія беларускія цэментныя заводы з непасрэдным удзелам інстытута перарабляюць свае патокі падобна касцюковіцкім. І ўвесь сухі спосаб інстытут праектуе з прымяненнем цвёрдага, пылавіднага паліва. Бо на яго зусім іншая цана — вугаль каштуе танней, сусветная цана тут больш стабільная і менш падвяргаецца рознага роду кан'юнктурным уплывам, чым цана на газ.

Адным словам, «смутныя» часы прайшлі, калектыў працуе з году ў год стабільна. Спраўляецца з задачамі, якія яму ставіць міністэрства і яе вялікасць Вытворчасць.

НА ПАЎКРОКА НАПЕРАДЗЕ ВЫТВОРЦАЎ

Каб прасачыць за развіццём навуковых даследаванняў у інстытуце, спатрэбіліся б тамы і тамы. Назавём усяго некаторыя накірункі і вынікі, не прэтэндуючы на ўсеахопнасць. Але і сціплы пералік дае прадстаўленне, наколькі актуальнымі былі заўсёды гэтыя пошукі і распрацоўкі.

У сярэдзіне 60-х гадоў у СССР па рашэнні саюзных органаў шырока разгортваецца меліярацыя зямель. Беларусі для іх асушэння патрабаваліся вялікія аб'ёмы дрэнажных труб. З улікам асаблівасцяў гліністай сыравіны інстытутам былі распрацаваны тэхналогіі вытворчасці керамічных дрэнажных труб для трох новых заводаў, узведзеных у Віцебску, Брэсце і Маладзечне. На ўсіх гэтых заводах інстытут ажыццяўляў пусканаладачныя работы і актыўна ўдзельнічаў у асваенні вытворчасці. І затым пастаянна ўдасканальваў работу абсталявання і канструкцыю дрэнажных сістэм.

Значнае месца ў даследаваннях занялі распрацоўкі па стварэнні ліцавых і аддзелачных матэрыялаў і вырабаў на аснове керамікі. Побач з распрацоўкай ліцавой цэглы праводзяцца даследаванні па стварэнні тэхналогіі вытворчасці фасаднай плітак на аснове мясцовай сыравіны, а затым — дыванова-мазаічнай і шклокерамічнай плітак. Наступная задача, якая была паспяхова вырашана, — распрацоўка тэхналогіі вытворчасці пустацелай цэглы і эфектыўных керамічных камянёў. А ў першай палове 80-х ужо праводзяцца даследаванні па атрыманні высокаэфектыўных сценавых керамічных блокаў. Адначасова з'яўляецца тэхналогія вытворчасці тугаплаўкай цэглы з мясцовых глін.

Распрацоўкі ў галіне керамічных матэрыялаў абаронены 20 вынаходніцтвамі СССР, а распрацоўкі ў галіне цеплатэхнічных працэсаў і апаратаў — 13 аўтарскімі пасведчаннямі СССР.

Такімі ж эфектыўнымі былі даследаванні па вяжучых матэрыялах — толькі работы па рэгенерацыі вапны абаронены 4 аўтарскімі пасведчаннямі СССР, і столькі ж аўтарскіх пасведчанняў атрымана за надзвычай актуальныя распрацоўкі ў галіне вытворчасці цэменту. У гэтай сувязі прыгадаем, што значныя работы па тэхналогіі цэменту ў інстытуце пачалі праводзіць яшчэ на мяжы 70-х гадоў. А ўжо ў 80-х інстытут распрацоўваў праекты па сушцы і папярэдняй дэкарбанізацыі цэментна-сыравіннай сумесі для Магнітагорскага цэментнага завода, ВА «Вольскцэмент» і шэрагу іншых вытворчых гігантаў Расіі. Набытыя веды і вопыт дапамаглі інстытуту эфектыўна ўдзельнічаць у мадэрнізацыі цэментнай галіны Беларусі, аб чым мы гаварылі вышэй.

Патэнтамі і аўтарскімі пасведчаннямі СССР і Рэспублікі Беларусь абаронены дзесяткі распрацовак — па гіпсавых вяжучых матэрыялах, мінеральных плітах, пенашкле, пенапласце і абсталяванні для яго вытворчасці, па керамзіце, ячэістым бетоне, бетонапалімерах і нават па аддзелачных матэрыялах. Свой «патэнт» — пропуск на «паток» рэгулярна выдаюць вытворцы. Усё гэта сведчыць аб шырыні і паспяховасці творчага пошуку.

Творчага ў поўным сэнсе слова. Усяго адзін прыклад з дзейнасці навукова-даследчай лабараторыі цеплаізаляцыйных матэрыялаў. Уласнай сыравіны для іх у Беларусі не багата. А будаўнічы матэрыял цікавы тады, калі ён вырабляецца з мясцовай сыравіны, а не з дарагой прывазной. Скажам, для вытворчасці мінеральнай ваты патрэбен базальт — 70 працэнтаў ад агульнага аб'ёму сыравіны, а гэтага мінералу ў Беларусі няма. У парадку імпартазамяшчэння базальт замянілі дыярытамі, лінзы якіх ёсць у Мікашэвічах. Атрыманая мінвата аказалася не горш за тую, якую робяць на імпартнай сыравіне. Цяпер, каб нам адмовіцца ад імпарту, мікашэвіцкаму заводу патрэбна набыць і паставіць у кар'ер спецыяльныя машыны, якія будуць праходзіць лінзы. Кошт абсталявання — недзе 2 мільярды беларускіх рублёў. Затрачаныя сродкі акупяцца, бо сыравіна пастаянна даражэе.

У тыя часы, калі стаяла пытанне аб выжыванні калектыву, якраз існавала патрэба ў цеплаізаляцыйных матэрыялах. Інстытут наладзіў у сябе на сокія спектральныя характарыстыкі шкляных ампул, якія і патрэбны ў фармацэўтыцы. Дослед-ныя ўзоры ампул зрабілі на Барысаўскім заводзе, аналагаў гэтай тэхналогіі ў свеце пакуль няма. Зараз вядзецца падрыхтоўка вытворчасці, будуюцца пабудаваны цэлы завод, і плануецца, што вытворчасць ампул новага пакалення ў неабходных для рэспублікі аб'ёмах пачнецца вельмі хутка. Імі зацікавіліся ў Расіі, Польшчы і ва Украіне.

Плюс яшчэ адно дасягненне, таксама звязанае з медыцынскім шклом. Супрацоўнікам лабараторыі шкла ўдалося рэалізаваць працэс раздзекі ампул без утварэння шкляной пыльцы. Што да гэтага часу не ўдавалася нікому ў свеце, нават вядучым вытворцам ампул.

②

③

④

⑤

МЭТА ЎСІХ РАСПРАЦОВАК — ВЫХАД НА «ПАТОК»

Партфель заказаў інстытута фарміруецца пад уздзеяннем рынкавага механізма. Каб ён быў поўным, кіраўніцтву патрэбна пастаянна працаваць з заводамі і структурамі міністэрства. Але прапановы на выкананне работ з ужо пралічанымі тэхніка-эканамічнымі абгрунтаваннямі вельмі часта ідуць і ад самога інстытута, які ведае кан'юнктуру будматэрыялаў у Еўропе і Расіі. У такім выпадку прапановы інстытута разглядаюць глаўкі прамысловасці і навукі міністэрства, затым сваё рашэнне прымае экспертны савет.

Але тым не менш заказчыкам можа быць асобнае прадпрыемства ці нават сама дзяржава ў асобе глаўка міністэрства — калі дзяржава хоча мець у сябе новы матэрыял. Напрыклад, пенабетоны. Палімерныя матэрыялы ўводзяцца ў склад бетонаў, і яны паляпшаюць цеплатэхнічныя паказчыкі бетонаў. Гэтая распрацоўка інстытута ўкаранёна, пенабетоны выпускаюцца беларускімі заводамі.

На Захадзе зараз пайшла мода на выкарыстанне ў будаўніцтве порыстай керамікі, так званых паратонаў. Пры фармаванні гліны дадаюць выгараючыя дабаўкі — у мікрааб'ёмах, і пасля абпальвання атрымліваецца порыстая структура. Будынкі становяцца больш лёгкімі (губляюць працэнтаў 20 сваёй вагі) і цёплымі. Пад гэты матэрыял нават створана галіновая праграма, міністэрства ўважліва сочыць за яе рэалізацыяй. Паратоны выпускаюць Радашковіцкі керамічны завод і Віцебская «Кераміка». Даручана таксама Мінскаму заводу будматэрыялаў, там пад гэтую праграму збіраюцца ставіць імпартную лінію.

Інстытут праводзіць выпрабаванні любой сыравіны для вытворчасці будматэрыялаў. Нават расіяне часта давяраюць інстытуту правесці выпрабаванні розных відаў сыравіны — як выкапняў, так і адходаў вытворчасці, той жа вугальнай прамысловасці. Лабараторыя робіць доследную партыю мяркуемага новага вырабу і прапускае яе праз выпрабавальны цэнтр. У выніку нараджаецца так званы рэгламент, якім і кіруецца далей вытворца. Былі заказы нават ад «Газпрама». У Расіі такія інстытуты, як мінскі, «ляглі», і не дзіўна, што знаходзяць беларусаў.

Распрацоўкі бываюць розныя, і лёс у іх розны. Інстытут распрацаваў экалагічна чыстыя, не шкодныя для чалавека бесфенольныя звязвальнікі на мінеральную вату, на аснове вадкага шкла. Зрабілі мінеральныя пліты, каб паказаць, як гэта выглядае на практыцы. Збіраліся наладзіць вытворчасць на заводзе ў Бярозе. Але распрацоўка засталася ляжаць «на паліцы».

І ўсё ж часцей «ноў-хаў» знаходзяць сваё месца ў вытворчасці. Бо, навучаны горкім вопытам, інстытут звычайна не пачынае распрацоўку, пакуль няма дакумента, падпісанага прадпрыемствам. Заказчык пацвярджае, што яго цікавіць гэты канкрэтны новы матэрыял ці новая тэхналогія, і ён бярэ на сябе абавязацельствы па ўкараненні. Тады з прамым удзелам інстытута вядзецца ўкараненне навінкі на гэтым прадпрыемстве, у выніку выпускаецца новая прадукцыя.

Інстытут праводзіць і сертыфікацыю будаўнічых матэрыялаў. Ёсць неабходнае абсталяванне для выпрабаванняў, пастаянна праводзіцца яго метралагічнае забеспячэнне. Па міністэрстве выдаецца загад, якія матэрыялы падлягаюць сертыфікацыі, існуе адпаведная інфармацыйная база пад патрабаванні ЕН, бо з пераходам на еўранормы ўзровень выпрабаванняў таксама павінен быць еўрапейскім. Набылі нават лабараторыю для правядзення выпрабаванняў цэменту па «езнаўскіх» нормах.

Часта па даручэнні глаўка інстытут распрацоўвае так званы рэгламент вытворчасці для адсталых прадпрыемстваў, каб дапамагчы калектыву выйсці з крызіснага стану. Зараз такую задачу вырашаюць па Гарынскім керамічным заводзе.

АСНОВА ЎСЯГО — КАЛЕКТЫЎ

Працуе ў «мазгавым цэнтры галіны» 180 чалавек. Асабліва важна, што многія, ледзьве не палова, прайшлі праз школу вытворчасці. І часцей за ўсё маюць за плячыма вопыт работы тэхнолага будматэрыялаў, а гэта вялікі плюс для навуковага супрацоўніка. Калектыў папаўняецца за кошт выпускнікоў ВНУ, і перш за ўсё тэхналагічнага ўніверсітэта. Да прыкладу, у лабараторыі бетонаў сёння працуюць чатыры яго выпускнікі, у тым ліку загадчык лабараторыі і два загадчыкі сектараў. Прыходзяць спецыялісты і пасля вучобы ў профільнай аспірантуры. Ідзе актыўны пошук маладых перспектыўных кадраў, якія маглі б прыўнесці «свежы струмень».

У калектыве працуюць два доктары тэхнічных навук — Уладзімір Мікалаевіч Ганчарык і Уладзімір Апанасавіч Конеў. Уладзімір Мікалаевіч перад гэтым доўгі час узначальваў мінскі філіял Усесаюзнага навукова-даследчага і праектна-канструктарскага інстытута па аўтаматызацыі прадпрыемстваў будматэрыялаў. Уладзімір Апанасавіч прыйшоў з інстытута прыкладной фізікі НАНБ, зараз ён — вядучы навуковы супрацоўнік у лабараторыі шкла.

Працуюць таксама 11 кандыдатаў тэхнічных і хімічных навук. Ала Генадзьеўна Губская знайшла сябе ў галіне радыялогіі. Усе выкапні патрэбна правяраць на наяўнасць радыенуклідаў — і свае, і завозныя. Яна распрацавала сістэму захавання радыяцыйнай бяспекі на прадпрыемствах, у якую ўключана і правядзенне неабходных вымярэнняў.

Кандыдат хімічных навук Іван Апанасавіч Бялой выкладаў у тэхналагічным універсітэце, зараз займаецца бетонамі, ячэістымі бетонамі, вяжучымі матэрыяламі — цэментам, вапнай. Загадчык лабараторыі шкла Валадзімір Барысавіч Шпектар закончыў мехмат, загадваў навукова-даследчай лабараторыяй на «рэжымным» прадпрыемстве, затым выкладаў у БНТУ. Зараз актыўна займаецца ўкараненнем нанатэхналогій у вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Лабараторыяй вяжучых матэрыялаў загадвае кандыдат тэхнічных навук Віктар Лявонцьевіч Більдзюкевіч. Віктар Лявонцьевіч у свой час узначальваў Міністэрства будаўнічых матэрыялаў рэспублікі і зрабіў для развіцця галіны многа карыснага. Чалавек тэхнічнага разумовага складу, вельмі энергічны, ён і зараз працуе многа і эфектыўна. Укараненне сухога спосабу вытворчасці цэменту на беларускіх заводах вядзецца пад яго навуковым кіраўніцтвам.

Гэты пералік можна працягваць.

Група маладых супрацоўнікаў працуе над кандыдацкай дысертацыяй. Значыць, ёсць каму развіваць традыцыі калектыву.

ПЛАНЫ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Нарастаюць тэмпы жыллёвага будаўніцтва. Кошт будматэрыялаў займае каля 60—65 працэнтаў усяго кошту новага жылля. Сваю задачу калектыў бачыць у тым, каб павышаць спажывецкія вартасці будаўнічых матэрыялаў. І каб пры гэтым яны рэзка не «скокнулі» ў цане. З усіх новых накірункаў навукі тут выдзяляюць нанатэхналогіі. Яны дапамогуць павысіць трываласць і надзейнасць будматэрыялаў з дапамогай мікраармявання звышультратонкім шкловалакном, што ў сваю чаргу дазволіць адчувальна палегчыць канструкцыі і прыдасць «другое дыханне» айчыннаму буйнапанельнаму домабудаванню. А індустрыяльнае жыллёвае будаўніцтва заўсёды было больш танным і эфектыўным.

Будматэрыялы — цудоўны палігон для адпрацоўкі і прымянення нанатэхналогій, лічаць у інстытуце. У найбліжэйшых планах — стварэнне спецыялізаванай лабараторыі, якая займалася б толькі распрацоўкай і ўкараненнем нанатэхналогій у вытворчасць сучасных будматэрыялаў. І ў пэўнай ступені менавіта з «раскруткай» гэтага новага напрамку тут звязваюць будучыню калектыву.

Вельмі перспектыўным накірункам лічаць кампазіты. Спалучэнне арганікі і неарганікі ў іх дае такія цікавыя ўласцівасці, аб якіх іншым разам і не здагадваешся. І можна дабівацца паказчыкаў, якія зараней запраграмуеш. Калі паспрабаваць выстраіць па «ранжыру», то кампазіты ідуць адразу ўслед за нанатэхналогіямі.

Планаў і задумак шмат. Той багаты вопыт, які накоплены калектывам за 68 гадоў, дазваляе думаць, што яны будуць ажыццёўлены.

Публікацыю падрыхтавалі
Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ,
Вераніка АРЛОЎСКАЯ
і Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

⑥


⑦

⑧


⑨

⑩

⑪

НА ЗДЫМКАХ:

1. Будаўнічыя матэрыялы — цудоўны палігон для прымянення нанатэхналогій, лічаць загадчык лабараторыі шкла Валадзімір ШПЕКТАР (крайні справа) і яго калегі — інжынер 2-й катэгорыі Галіна АСТРОЎСКАЯ, загадчык сектара Андрэй ПАДКАВЫРАЎ і інжынер 2-й катэгорыі Пётр ДЗЕРАВЯНКА.

2. Такія цуда-блокі ўдалося вырабіць з адходаў ячэістага бетону.

3. Доктар тэхнічных навук Уладзімір ГАНЧАРЫК кіраваў інстытутам амаль 15 гадоў, і сённяшнія поспехі калектыву напрамую звязаны з яго дзейнасцю.

4. Вядучы інжынер лабараторыі цеплафізічных даследаванняў Вольга МАЖАНКОВА праводзіць даследаванне будматэрыялаў у кліматычнай камеры.

5. Колькасць прыродных радыенуклідаў у будматэрыялах вызначаюць навуковы супрацоўнік Ядзвіга ІЛЛЮХІНА і інжынер 1-й катэгорыі Таццяна ВАШКЕВІЧ.

6. Інжынер Наталля ВАЛАДЗЬКО і навуковы супрацоўнік Ксенія СЕНАТАВА за вырабам узораў для выпрабаванняў цэменту.

7. Ампулы са святлоадбівальным пакрыццём з першай доследнай партыі, выкананыя з выкарыстаннем нанатэхналогій.

8. Даследаванне ліцавой цэглы пры нізкіх тэмпературах праводзіць інжынер 2-й катэгорыі Марыяна ПАЗНЯКОВА.

9. А гэта — вымярэнне механічнай трываласці парызаваных блокаў на сціскванне, яго праводзіць Святлана КУДРЭВІЧ.

10. Ветэран галіны Віктар БІЛЬДЗЮКЕВІЧ і зараз працуе многа і эфектыўна.

11. Наколькі нанатэхналогіі мяняюць якасныя характарыстыкі і эстэтыку шкло-блокаў, дэманструе малодшы навуковы супрацоўнік Алеся ТАРАСЕВІЧ.

УП «НІІСМ»
220014, г. Мінск, вул. Мініна, 23. Тэл./факс 226 26 60.
УНП 100122953

ПЯТНІЦА, 30 ЛІСТАПАДА

5.35, 15.50 Серыял «Прыіск».
6.20, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
6.30, 7.05 Прэс-агляд.
6.45, 7.45, 19.30 Зона Х.
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.15 Навіны.
7.30, 8.30 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.05, 19.55 Серыял «Ліквідацыя».
10.00, 16.45 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.55, 17.45 Серыял «Каханне як каханне-2».
12.10 Маст. фільм «Бой пасля перамогі».
13.35 Відэафільм АТН «Малая радзіма».
14.05 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
14.50 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Серыял «Клава, давай!».
21.00 Панарама.
21.45, 1.45 Серыял «Медыум».
22.50 «Жорсткая размова».
23.25 Дзень спорту.
23.35 Фігуры.
0.05 Трагікамедыя «Клубная манія».

6.00, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 0.00, 3.00 Нашы навіны.
6.05, 15.00 «Лаліта. Без комплексаў».
7.05 «Наша раніца».
9.05 «Таццянін дзень». Серыял.
10.00 «Модны прыгавор».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 0.15, 3.20 Навіны спорту.
11.10 «Застацца ў жывых».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Мая цудоўная няня».
13.40 «Дэтэктывы».
14.10 «Прыгоды Джэкі Чана».
14.30 «Кантрольная закупка».
16.15 «Дачка садоўніка». Серыял.
17.15 «Няхай гавораць».
18.20 «Дакументальны дэтэктыў». «Аперацыя «Кансорцыум».
18.55 Поле цудаў.
20.00 Час.
21.05 «Дзве зоркі-2».
23.30 «Наша Russia».
